Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 ЛІПЕНЯ 2017 г. СУБОТА №134 (28498)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Хочаш у роту — прайдзі кастынг

СТАР. 4



Дакументальнае кіно «Беларусьфільма»

СТАР. 5



Чытачы «Звязды» жартуюць

СТАР. 8

# У ПЕРСПЕКТЫВЕ — СУМЕСНЫЯ ПРАЕКТЫ

## Прэзідэнты Беларусі і Малдовы правялі двухбаковую сустрэчу

**Нашы краіны звязваюць не толькі гады ўсталяваных дыпламатычных адносін, але і агульнае савецкае мінулае, эканамічнае супрацоўніцтва, чалавечыя кантакты. Пра тое, што яднае Беларусь і Малдову, кіраўнікі дзвюх дзяржаў гаварылі падчас сустрэчы ў Віцебску.**

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што з савецкіх часоў з павагай ставіцца да малдаўскай зямлі і людзей, якія на ёй жывуць. Малдаване — вялікі народ, у якога шмат агульнага з беларускім, бо ён такі ж працалюбівы, як і наш.

«Асаблівасць вашага візіту ў тым, што вы самі паглядзелі Беларусь. Вы яе, можна сказаць, памацалі: у прамысловасці, сельскай гаспадарцы, пабывалі на культурных аб'ектах, пабачылі, як мы ставімся да памяці. Мы не проста піярымся і расказваем, якія мы няшчасныя, і як у вайне нам было цяжка. Мы захоўваем гэтую памяць, — сказаў беларускі лідар. — Я магу з вамі размаўляць як з чалавекам, які пазнаў Беларусь».

Кіраўнік беларускай дзяржавы заявіў аб гатоўнасці развіваць супрацоўніцтва паміж краінамі ў любой сферы — ад прамысловасці да сельскай гаспадаркі. «Мы ад вас нічога не хаваем. Вы блізкі для нас чалавек. Мы з вамі прытрымліваемся практычна аднолькавых поглядаў. Вы памятайце, што мы ў любы момант гатовы дапамагчы, падставіць сваё плячо», — выказаў гатоўнасць Аляксандр Лукашэнка.

У сваю чаргу Прэзідэнт Малдовы Ігар Дадон сказаў, што ў яго засталіся выключна станоўчыя ўражанні ад візіту ў Беларусь. «Нам ёсць чаму ў вас павучыцца. Я кажу гэта шчыра, адкрыта. Я бачыў прадпрыемствы і ў Еўрапейскім саюзе, але той узровень, на які паднялася прамысловасць у Беларусі, для нас толькі мара на гэтым этапе. Мы маем намер па некаторых кірунках больш паглыблена запусціць сумесныя праекты», — сказаў ён.

**Вераніка ПУСТАВІТ,** *г. Віцебск. pustavit@zviazda.by*

# АЎТАРЫТЭТ У СУПОЛЬНАСЦІ НАЦЫЙ

**«Славянскі базар у Віцебску» — равеснік незалежнай Беларусі. За гэтыя гады ён стаў візітнай карткай краіны, а Віцебск — сапраўднай культурнай сталіцай, у якой за 25 гадоў правядзення фестывалю пабывалі дэлегацыі з 72 дзяржаў.**




Фота БЕЛТА.



Аляксандр Лукашэнка ўручыў узнагароду ўладальніцы Гран-пры XV Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу «Віцебск-2017» Марыі Магільнай.

## МІСІЯ — АБ'ЯДНОЎВАЦЬ

«Мы сардэчна прымаем удзельнікаў і паклоннікаў фестывалю, якія прыбылі з Еўропы, Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Гэта красамоўна сведчыць не толькі аб яго папулярнасці, але і аб узрастаючым аўтарытэце Беларусі ў супольнасці нацый», — сказаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка з галоўнай сцэны фестывалю перад пачаткам цырымоніі адкрыцця.

Ганаровымі гасцямі свята сёлета сталі Прэзідэнт Малдовы, дзяржаўны сакратар Казахстана, кіраўнікі дыпламатычных прадстаўніцтваў шэрагу дзяржаў. За чвэрць стагоддзя «Славянскі базар у Віцебску» стаў «люстэркам» найноўшай гісторыі.

«Успамінаюцца часы, калі на постсавецкай прасторы руйнаваліся шматгадовыя асновы, і людзям было не да мастацтва. Менавіта тады мы пастараліся сабраць разам усе творчыя сілы дзеля агульнай справы — духоўнага адраджэння і працягу лепшых традыцый», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

СТАР. 2

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ЗІНОЎСКІ, міністр эканомікі:**

*«У нас, паводле прагнозу, павінна была быць інфляцыя не больш за 9%, але ход набору індэкса спажывецкіх цэн дазваляе спадзявацца, што яна не будзе больш за 7%. Самае галоўнае, каб нашы прадпрыемствы і арганізацыі, якія выпрацоўваюць прадукцыю, зніжаючы выдаткі, не павялічвалі цану. Упэўнены, што ў найбліжэйшы час мы можам знізіць гадавую інфляцыю да 5%, а гэта значыць, што грошы, якія прыйдуць у эканоміку, будуць значна больш танныя».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.07.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9645 | ▲ |
| Еўра | 2,2418 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0328 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0755 | ▼ |

■ Прыёмная кампанія — 2017

# «Геаграфія» стабальнікаў: ад Ліцэя БДУ да сельскай школы

**Да 17 ліпеня ў беларускіх ВНУ працягваецца прыём дакументаў на бюджэтную форму навучання. А тым часам Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў агучыў папярэднія вынікі асноўнага і рэзервовага этапаў ЦТ.**

Сёлета ў цэнтралізаваным тэсціраванні прынялі ўдзел 90 125 абітурыентаў. Абсалютныя вынікі (100 балаў) прадэманстравалі 303 удзельнікі ў 314 выпадках. 100 балаў па двух вучэбных прадметах атрымалі 11 абітурыентаў, а 292 — па адным.

На ЦТ па рускай мове зарэгістравана 66 стабальных вынікаў, а па беларускай — 35. Улічваючы, што беларускую мову здавала ўтрая менш абітурыентаў, справіліся з тэстам па роднай мове яны зусім нядрэнна.

На ЦТ па матэматыцы 100-бальныя сертыфікаты атрымалі 69 абітурыентаў, а здавала яе каля 50 тысяч чалавек, па фізіцы — 15, хіміі — 25, грамадазнаўстве — 16, замежных мовах — 49, біялогіі — 18, гісторыі Беларусі — 19, геаграфіі — 1, сусветнай гісторыі найноўшага часу — 1.

У ліку абітурыентаў, якія атрымалі 100-бальныя сертыфікаты, 250 выпускнікоў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі бягучага года: сярод іх 100 выпускнікоў гімназій, 65 — ліцэяў, 85 скончылі звычайную сярэднюю школу, 1 выпускнік установы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, а таксама 51 выпускнік устаноў адукацыі мінулых гадоў і 1 абітурыент, які скончыў установу адукацыі ў гэтым годзе за межамі Беларусі.

Найбольшай колькасцю стабальных вынікаў могуць пахваліцца выпускнікі ўстаноў адукацыі Мінска (82) і раённых цэнтраў (87). Таксама па адным стабальным сертыфікаце атрымалі і 9 выпускнікоў устаноў адукацыі, размешчаных у сельскай мясцовасці.

Як бачна, тэсты з'яўляюцца цалкам даступнымі для выканання, незалежна ад тыпу ўстановы адукацыі і месца яе размяшчэння. Сярод уладальнікаў максімальнага выніку ёсць як выпускнікі элітарнага Ліцэя БДУ, так і выпускнікі самых звычайных сярэдніх школ. Прычым выпускнікі сельскіх школ не саступаюць гараджанам па ўдзельнай вазе абсалютных вынікаў на ЦТ (улічваючы нешматлікасць вяскоўцаў у агульным патоку абітурыентаў).

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Па сутнасці

# ТРЫ ЎКАЗЫ І ШМАТ ПЫТАННЯЎ

## Як атрымаць дзяржпадтрымку на будаўніцтва жылля?

**Па словах начальніка ўпраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Аляксандра ГОРВАЛЯ, праект пастановы аб прадастаўленні адрасных субсідый на будаўніцтва жылля ўжо вынесены на грамадскае абмеркаванне. Аб гэтым ён сказаў падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА. Дакумент будзе дэталізаваць дзеянне Указа №240 «Аб дзяржаўнай падтрымцы грамадзян пры будаўніцтве (рэканструкцыі) жылых памяшканняў».**

Нагадаем, што Указ №240 уводзіць у Беларусі адраснае субсідаванне ў жыллёвым будаўніцтве. Яно прадугледжвае выплату часткі працэнтаў за карыстанне крэдытам на будаўніцтва жылля, атрыманым грамадзянамі ў любым камерцыйным банку, а шматдзетным і маладым сем'ям і дзецям-сіротам — таксама пагашэнне часткі асноўнага доўгу па такіх крэдытах. Пры гэтым атрымаць субсідыі могуць усе грамадзяне, якія маюць права на атрыманне дзяржаўнай падтрымкі ў адпаведнасці з Указам №13 «Аб некаторых пытаннях прадастаўлення грамадзянам дзяржаўнай падтрымкі пры будаўніцтве (рэканструкцыі) або набыцці жылых памяшканняў» ад 6 студзеня 2012 года.

Тэкст праекта пастановы ўжо цяпер размешчаны на сайце Мінбудархітэктуры ў раздзеле «Абмеркаванне нарматыўна-прававых актаў». У ім прапісана, якія неабходны дакументы, пазначаны тэрміны іх падачы, а таксама ўказаны ведамствы, якія іх прымаюць. Мяркуецца, што грамадскае абмеркаванне пройдзе да 20 ліпеня. Да 6 жніўня пастанова павінна быць прынята, каб запрацаваў указ. Таксама цяпер удакладняецца пералік аб'ектаў з прыцягненнем адрасных субсідый на суму ў 135 мільёнаў рублёў пад Указ №240. Чакаецца, што будуць дадавацца грошы камерцыйных банкаў, а значыць стануць з'яўляцца і новыя аб'екты. Аляксандр Горваль растлумачыў, што канчатковы спіс таксама сфарміруецца да 6 жніўня.

СТАР. 2

■ Найлепшыя ў прафесіі

# ПРЫБРАЦЦА Ў ДВАРЫ І... УБАЧЫЦЬ КАЛІЗЕЙ

**Ці лёгка звычайнаму дворніку адправіцца на бясплатны адпачынак у Рым? Так, калі ён працуе ў Цэнтральным раёне сталіцы. Ужо трэці месяц тут працягваецца конкурс «Найлепшы дворнік», пераможца якога, сярод іншага, будзе ўзнагароджаны паездкай у сталіцу Італіі. Днямі 20 найлепшых прадстаўнікоў прафесіі, якія выйшлі ў фінал спаборніцтва, сустрэліся ў адным з мінскіх рэстаранаў за кубкам кавы з прадстаўнікамі адміністрацыі раёна, у тым ліку з яе кіраўніком Ігарам Бузоўскім. Удзельнікі абмеркавалі ўмовы правядзення трэцяга і апошняга этапу конкурсу, правялі лёсаванне, а таксама пагутарылі з кіраўніцтвам жыллёва-камунальных службаў і, вядома, карэспандэнтам «Звязды».**



Сам конкурс распачаўся 1 мая — тады арганізатары атрымалі чатыры дзясяткі заявак ад ахвотных змагацца за турыстычную паездку ў Заходнюю Еўропу. Пасля гэтага было арганізавана «народнае галасаванне» — у сацыяльнай сетцы «УКантакце» кожны жыхар Цэнтральнага раёна сталіцы мог падтрымаць свайго кандыдата. Па выніках «плебісцыту» былі вызначаны 20 фіналістаў. У хуткім часе кожнага з іх чакае раптоўны візіт спецыяльнай камісіі, якая ацэніць стан дваровых тэрыторый, адказнасць за якія нясуць кандыдаты, і вынесе канчатковае рашэнне наконт пераможцы.

СТАР. 3

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Кітай — найбуйнейшы імпарцёр нафты ў свеце



Кітай у першым паўгоддзі стаў найбуйнейшым у свеце імпарцёрам нафты, абышоўшы па гэтым паказчыку ЗША. У студзені—чэрвені бягучага года імпарт гэтага паліва ў Кітай вырас на 13,8% — да 212 млн бараляў, перадае «Інтэрфакс».

Кітай у першым паўгоддзі закупляў прыкладна 8,59 млн бараляў у суткі (б/с), тады як ЗША ўвозілі 8,14 млн б/с. Кітай нарасціў імпарт нафты на фоне намаганняў па стварэнні стратэгічных запасаў і павышанага попыту з боку незалежных нафтаперапрацоўчых кампаній. Імпарт іншага энергарэсурсу, вугалю таксама вырас у першым паўгоддзі, рост склаў 23,5% — да 763,2 тыс. тон у суткі. У чэрвені Кітай імпартаваў ў сярэднім 720 тыс. тон вугалю ў суткі.

У першым паўгоддзі цэны на вугаль на ўнутраным рынку КНР былі высокія, кажуць эксперты, тады як на сусветным рынку кошт вугалю параўнальна нізкі. Пры гэтым у другім паўгоддзі па меры спынення дзеяння абмежаванняў на здабычу вугалю ў Кітаі яго імпарт можа скараціцца.

## У Лондане падлеткі рабуюць з дапамогай кіслаты

Лонданская паліцыя затрымала падлетка, які здзейсніў серыю нападаў на мясцовых жыхароў пры дапамозе кіслаты. Адзін з пацярпелых знаходзіцца ў шпіталі ў крытычным стане, паведамляе BBC.

Усе атакі адбыліся ў лонданскіх раёнах Хэкні, Стоўк Ньюінгтан і Іслінгтан. Напады здзяйсняліся двума маладымі людзьмі, якія перамяшчаліся на мапедзе. Злачынцы пад'язджалі да сваіх ахвяр, якія таксама ехалі на мапедах або ішлі пешшу, плёскалі ім у твар атрутнай вадкасцю, пасля чаго рабавалі. Аднаму з арыштаваных прад'яўленыя абвінавачванні ў нанясенні калецтваў і рабаванні. Атакі пры дапамозе кіслаты адбываюцца на лонданскіх вуліцах досыць рэгулярна: у 2015 годзе было зафіксавана 261 такое нападзенне, у 2016 годзе — 458, з пачатку 2017 — 120 выпадкаў «кіслотных атак».

## Дзеля чаго дэмакраты ЗША гатовыя кінуць піць

Амерыканцаў спыталі ў інтэрнэце, што можа падштурхнуць іх адмовіцца ад выпіўкі, і тры чвэрці ўдзельнікаў апытання партала detox.net, якія падзяляюць дэмакратычныя погляды, растлумачылі, што іх можа заахвоціць да гэтага імпічмент прэзідэнта ЗША Дональда Трампа.

Больш за 73% дэмакратаў заявілі, што кінуць піць, калі Трампу абвесцяць імпічмент на наступны дзень. Пры гэтым толькі 30,6% рэспубліканцаў адмовяцца ад спіртнога, калі прэса перастане пісаць пра звязаныя з прэзідэнтам скандалы.

Зрэшты, адной палітыкай апытанне не абмяжоўвалася: напрыклад, 40% амерыканцаў, якія выпіваюць штодня, заявілі, што больш ахвотна б страцілі ўласнага гадаванца, чым адмовіліся б ад алкаголю. Чвэрць з гэтай групы аддалі перавагу таму, каб пазбавіцца нюху, прыкладна столькі ж — пазбавіцца аднаго пальца рукі, але не кідаць згубную звычку. Сярод тых, хто ўжывае алкаголь толькі некалькі разоў у год, гэтыя паказчыкі куды больш сціплыя: 9% хутчэй адмовіліся б ад гадаванца, 2% — ад нюху, а вось губляць пальцы дзеля алкаголю сярод практычна непітушчых амерыканцаў ніхто не захацеў. Акрамя таго, даследчыкі высветлілі: чалавеку трэба заплаціць у сярэднім 365,5 тысячы долараў, каб ён пагадзіўся кінуць піць да канца сваіх дзён.

## У Нью-Ёрку вылучаць 32 мільёны на барацьбу з пацукамі

Мэр Нью-Ёрка Біл Дэ Блазіа вылучыў 32 мільёны долараў на барацьбу з пацукамі ў горадзе, паведамляе ABC News.

У некалькіх раёнах горада пачнецца замена смеццевых скрынь на жалезныя, таксама заменяць падлогу ў падвалах дамоў на бетонную, закупяць новыя апараты для спрасоўвання адходаў, якія пацукі не змогуць адкрыць. У лютым улады Нью-Ёрка заявілі, што адзін чалавек памёр з-за рэдкай хваробы, якая перадаецца пацукамі, яшчэ два сур'ёзна пацярпелі. Даследаванні 2014 года паказваюць, што ў горадзе жыве два мільёны грызуноў, хоць раней лічылася, што іх папуляцыя складае восем мільёнаў асобін. У сакавіку 2015 года навукоўцы знайшлі ў нью-ёркскіх грызуноў пацучыную паўднёвую блыху — пераносчыка бубоннай чумы. Менавіта гэта захворванне назвалі «чорнай смерцю», і яно стала прычынай разбуральнай эпідэміі ў XIV стагоддзі, якая забіла ад 25 да 50 мільёнаў еўрапейцаў.

■ Падпіска—2017

# «ЗВЯЗДА» — ГЭТА ЎЖО ПАЖЫЦЦЁВА...»

**Тры з невялічкім тыдні застаецца да стагадовага юбілею найстарэйшай беларускай газеты. Напярэдадні яго, бліжэй да 9 жніўня, ну, вядома ж, трэ будзе, спыніцца і азірнуцца — на пройдзены шлях, на тое, што ўдалося і не ўдалося зрабіць, падвесці вынікі, падзякаваць усім, хто шчыраваў тут раней, хто выпісваў, і, нягледзячы ні на што, працягвае выпісваць адзіную беларускамоўную...**

**Але ж, каб зрабіць вось гэта, апошняе, то-бок, каб падзякаваць чытачам, ёсць падставы і зараз. Ну, па-першае, завяршылася чарговая падпісная кампанія, па-другое, у сценах рэдакцыі адбыўся чарговы розыгрыш прызоў.**

Лёс іх, як заўжды, вырашалі госці — адданы падпісчык і, можна сказаць, адзін з улюбёных аўтараў газеты, дацэнт Белдзяржуніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Іван Іванавіч Астроўскі і кінааператар студыі «Летапіс» кінастудыі «Беларусьфільм» Георгій Георгіевіч Караленак. Яны ж, госці, мелі магчымасць пераканацца, што ўсе дасланыя карткі ў рэдакцыі зарэгістраваны, размеркаваны па абласцях, а галоўнае, што ўсе яны, так бы мовіць, «прайшлі» праз чароўны звяздоўскі капялюш, з якога трэ было выцягнуць шчаслівыя.

СТАР. 3




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Спецыяліст аддзела маркетынгу выдавецкага дома «Звязда» Юлія КАЗУРА і падпісчыкі газеты Георгій КАРАЛЁНАК і Іван АСТРОЎСКІ.

ISSN 1990 - 763X

■ Эканоміка

# БЕЛАРУСКІ ТРАКТАР ДЛЯ ВЫСАКАГОР'Я

### Першы беларуска-таджыкска-афганскі бізнес-форум адбудзецца ў Душанбэ ў канцы ліпеня

**Аб гэтым заявіў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Таджыкістане і Афганістане па сумяшчальніцтве Алег ІВАНОЎ. Мерапрыемства адбудзецца ў рамках Міжнароднай універсальнай выстаўкі-кірмашу «Таджыкістан-2017» з 27 па 29 ліпеня, і ўжо сёння каля 100 бізнесменаў з Афганістана пагадзіліся прыехаць на форум.**

— Нашы двухбаковыя адносіны з Афганістанам знаходзяцца ў стадыі станаўлення, але ўжо ў 2015—2017 гадах адбыліся сустрэчы на вышэйшым і высокім узроўнях, візіты дзелавых колаў у Беларусь. Гэта з'яўляецца пацвярджэннем зацікаўленасці афганскага боку ў актывізацыі кантактаў у палітычнай, эканамічнай, гуманітарнай, сацыяльнай і іншых сферах, — адзначыў беларускі пасол.

Паводле слоў дыпламата, для абодвух бакоў існуе мноства абласцей, у якіх рэальна арганізаваць супрацоўніцтва, выгаднае і для Беларусі, і для Афганістана. Асноўным кірункам з'яўляецца беларуская тэхніка, якую можна пастаўляць на афганскі рынак — прычым, гэта можа быць як сельскагаспадарчае, так і грузавое або спецыяльнае абсталяванне. Сёння беларускае пасольства прасоўвае малочную прадукцыю, лекі, калійныя ўгнаенні, шыны, керамічную плітку і іншыя тавары.

У 2016 годзе тавараабарот Беларусі і Афганістана склаў 26,4 мільёна долараў і ў параўнанні з 2015-ым вырас на 60 працэнтаў. У перыяд са студзеня па май 2017 года тавараабарот склаў 9,1 мільёна долараў — у параўнанні з аналагічным перыядам за папярэдні год можна канстатаваць павелічэнне на 87,7 працэнта.

У адрозненне ад супрацоўніцтва з Афганістанам, якое толькі пачынае набіраць абароты, беларуска-таджыкскія адносіны ў сферы эканомікі знаходзяцца на здавальняючым узроўні. Разам з тым, паказчыкі ўзаемнага гандлю ў апошнія гады не адпавядаюць патэнцыялу эканомік абедзвюх краін. «Але мы робім усе намаганні, каб выправіць сітуацыю, якая склалася», — падкрэсліў дыпламат.

Паляпшэнню эканамічных паказчыкаў можа спрыяць зборачная вытворчасць беларускай сельгастэхнікі, якую плануецца адкрыць на тэрыторыі Таджыкістана восенню. «Там будзе прадстаўлена розная тэхніка такіх брэндаў, як «Бабруйскаграмаш», «МТЗ», «Гомсельмаш», — паведаміў Алег Іваноў.

Сярод патэнцыйных пазіцый — больш за 10 мадэляў, у тым ліку трактары, прычэпы і касілкі для высакагор'я. «Таксама на базе гэтай зборкі мы хочам зрабіць навучальны цэнтр», — дадаў дыпламат.

Беларуская тэхніка не толькі рэалізуецца на тэрыторыі горнай краіны — для яе абслугоўвання і паставак запасных частак арганізаваны спецыяльныя дылерскія і сэрвісныя цэнтры ў некалькіх гарадах Рэспублікі Таджыкістан.

У цэлым, двухбаковы тавараабарот з Таджыкістанам за перыяд са студзеня па май 2017 года павялічыўся ў 2,7 раза ў параўнанні з аналагічным перыядам за 2016 год — і склаў больш за 16 мільёнаў долараў. Экспарт і імпарт таксама павялічыліся ў 2,9 і 1,9 разы адпаведна.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
*lukashevich@zviazda.by*

■

# АЎТАРЫТЭТ У СУПОЛЬНАСЦІ НАЦЫЙ



***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Гэтую місію якраз і ўзяў на сябе фестываль, які стаў сімвалам яднання мільёнаў людзей добрай волі. Ён служыць высакароднай мэце — умацаванню міру і ўзаемаразумення паміж народамі, захаванню культурнай разнастайнасці і падтрымцы талентаў. Прэзідэнт Беларусі звярнуў увагу, што з набыццём шырокай вядомасці кансалідуючая роля віцебскага форуму ўзрасла яшчэ больш.

«Ён у поўнай меры спрыяе канструктыўнаму міждзяржаўнаму дыялогу. Любы замежны госць, які пабываў на нашым фестывалі, вяртаецца ў сваю краіну пасланцом міру», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што высокі міжнародны статус фестывалю да многага абавязвае Беларусь. «Ён — своеасаблівае люстэрка палітыкі нашай краіны ў сацыяльна-гуманітарнай сферы. Таму на ім прадстаўлена такая разнастайнасць формаў і жанраў мастацтва. Узровень канцэртаў, выстаў і спектакляў, творчых сустрэч нязменна высокі», — лічыць Прэзідэнт.

Беларускі лідар выказаў спадзяванне, што фестываль стане для маладых выканаўцаў выдатнай пуцёўкай у жыццё.

Сімвалічна, што на адкрыцці «Славянскага базару ў Віцебску» Аляксандр Лукашэнка ўзнагародзіў як маладую беларускую спявачку Марыю Магільную, так і ўсім добра вядомую народную артыстку Грузіі і Расіі Тамару Гвердцытэлі. Апошнюю — спецыяльнай узнагародай «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення». «Лёс мне падарыў любоў беларускага народа, і гэтая любоў узаемная. Я вас люблю, дзякуй вялікі за такі гонар!» — падзякавала Тамара Гвердцытэлі.



Фота БЕЛТА.

## НА АДНЫМ ДЫХАННІ

Канцэрт цырымоніі адкрыцця «Славянскага базару ў Віцебску» запомніцца надоўга. Некалькі гадзін цудоўнай прэзентацыі праляцелі незаўважна. Ад сцэны, якая пераліваласся мноствам фарбаў, цяжка было адарваць вочы. А «зорны» склад быў такі багаты, што іншым фестывалям сабраць адначасова аналагічную каманду знакамітых асоб наўрад ці атрымаецца.

Нават тыя, хто купілі білеты і чыталі афішу з прозвішчамі артыстаў, былі прыемна здзіўленыя. Адзін з сюрпрызаў — выступленне іераманаха Фоція з «Песнярамі». Песня «Белавежская пушча» ў іх выкананні кранула душу.

Калі выступаў Дзмітрый Калдун, на сцэне рухаўся вялікі кубак кавы. А падчас выканання песні пра каханне Зарай група падтанцоўкі выехала на веласіпедах. Выдатна выступіла беларуская зорачка, уладальніца Гран-пры сёлетняга дзіцячага конкурсу Маша Магільная. Шчыра праспявала пра тое, што душы так хочацца святла і цяпла.

Ядвіга Паплаўская, Руслан Аляхно і Дзмітрый Калдун выканалі песню, прысвечаную народнаму артысту Беларусі Аляксандру Ціхановічу, якому споўнілася б 65 гадоў... Публіка падтрымлівала трыа апладысментамі ў такт музыцы.

Многія артысты дзякавалі Прэзідэнту Беларусі за асабістую падтрымку ўнікальнага фэсту. Наталля Каралёва, Роза Рымбаева назвалі фестываль светлым, цікавым, непаўторным...

Легендарны Крыс дэ Бург па-руску запэўніў, што рады зноў пабываць у Беларусі. І выканаў шлягер пра жанчыну ў чырвоным. Пасля з захапленнем прымаў кветкі ад дам у чырвоных і ружовых сукенках.

У канцы канцэрта Рыгор Лепс выканаў песню «Самы лепшы дзень». Канешне, гэта і пра дзень, калі распачынаецца віцебскі фэст.

Канцэрт доўжыўся каля трох гадзін і скончыўся амаль апоўначы феерверкам.

Цяжка апісваць тое, што трэба бачыць і чуць. Канцэрт можна назваць шэдэўральным. У гэтым упэўніўся кожны, хто яго паглядзеў у рэальным часе, і пацвердзіць той, хто паглядзіць у запісе.

**Вераніка ПУСТАВІТ,**
*pustavit@zviazda.by*
**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

**P.S.** *Як заўсёды, конкурсы — у цэнтры ўвагі публікі і СМІ. Дзіцячы ўжо завяршыўся. Цяпер 21 малады канкурсант змагаецца за Гран-пры. Наш зямляк Ягор Шаранкоў выступае пад №14.*

■ За падзеяй

# ЗОРНАЯ ВАЛОШКА

**На «алеі зорак» каля Летняга амфітэатра з'явілася імя народнай артысткі Грузіі і Расіі Тамары Гвердцытэлі.**

У дзень урачыстага адкрыцця XXVI Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» на плошчы лаўрэатаў Спецыяльнай узнагароды Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь заззяла трынаццатая «зорка». Калі дакладней, валошка: замест звыклага сімвала Галівуда побач з імёнамі лаўрэатаў на гранітным квадраце беларусы змяшчаюць «цвяток радзімы» Максіма Багдановіча. Сёлета Спецыяльную ўзнагароду Беларусі «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення» атрымала народная артыстка Грузіі і Расіі Тамара Гвердцытэлі.




Фота БЕЛТА.

— Творчасць Тамары Гвердцытэлі папулярная ў многіх краінах свету, — адзначыў **міністр культуры Барыс СВЯТЛОЎ**. — Гэта сапраўды народная артыстка: яе песні гучаць не толькі на вялікіх сцэнах і ў канцэртных залах, але і ў звычайных дамах падчас сямейных свят. У нашай краіне спявачку даўно ведаюць і любяць як адданага сябра беларускай зямлі.

У Віцебск уладальніца непаўторнага голасу прыязджае яшчэ з тых часоў, калі знакаміты «Славянскі базар» быў «Усесаюзным фестывалем польскай песні». За гэты час Тамара Гвердцытэлі неаднаразова брала ўдзел у фестывальных мерапрыемствах і ў якасці спявачкі, і як член міжнароднага журы конкурсу маладых выканаўцаў. Сённяшняя «зорка» — сведчанне выдатнага ўнёску ў развіццё сучаснага музычнага мастацтва.

— Ва ўсе гады існавання «Славянскага базару ў Віцебску» мы хацелі міру на зямлі, — сведчыць Тамара Гвердцытэлі. — Адзінай нашай зброяй была музыка, якая гучала са сцэны. Я шчаслівая, бо сёння сапраўды станаўлюся часткай «Славянскага базару» і Віцебска — горада, які падарыў чалавецтву вялікага Марка Шагала.

**Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ.**

# ТРЫ ЎКАЗЫ І ШМАТ ПЫТАННЯЎ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***



Указ №240 уяўляе сабой новую сістэму дзяржаўнай падтрымкі. Дзеянні ранейшых сумежных указаў захоўваюцца. Па словах эксперта, дакумент увабраў у сябе тыя субсідыі дзяржавы, якія былі прадастаўлены пад Указ №585 «Аб прадастаўленні маладым і шматдзетным сем'ям фінансавай падтрымкі дзяржавы», таму ён і быў адменены. Разам з гэтым Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва ініцыюе падаўжэнне дзеяння Указа №585. І тут няма парадоксу. «Па гэтым Указе дапамога на пагашэнне камерцыйных крэдытаў не была прывязаная да чарговасці. Атрымлівалася так, што, калі вычэрпваўся ліміт крэдыту за год, першыя, хто стаіць у чарзе, ужо не атрымлівалі сродкаў. А ў гэты час чаргавікі, якія стаяць значна далей, мелі магчымасць атрымаць дзяржаўную падтрымку. У той жа час было разуменне, што некаторыя людзі апынуцца ў складанай сітуацыі. Трэба было гэта дадаткова ацаніць, і гэтая работа працягваецца», — падкрэсліў Алясандр Горваль.

Паводле яго слоў, міністр архітэктуры і будаўніцтва Анатоль Чорны, паглядзеўшы на сітуацыю, якая склалася, выказаў пазіцыю міністэрства аб працягу дзеяння Указа №585. «Хацелася б нагадаць, што цяпер разглядаецца варыянт захавання дзеяння гэтага ўказа на тыя аб'екты жыллёвага будаўніцтва, якія пачаты да ўступлення ў дзеянне Указу №240», — дадаў спецыяліст.

Ён удакладніў, што разглядаецца варыянт з унясеннем прапановы ў Адміністрацыю Прэзідэнта аб тым, каб даць магчымасць да 6 жніўня заключаць дамовы па Указе №585. «Трэба паглядзець, наколькі гэта будзе падтрымана, які перыяд зойме рэалізацыя такіх прапаноў у выпадку падтрымкі. Гэта будзе бачна, калі мы дакладна вызначымся і па колькасці сем'яў, і па аб'ёме сродкаў, бо сродкі трэба яшчэ дадаткова адшукаць. Цяпер у выканкамах удакладняюць гэтую інфармацыю, якая ў далейшым будзе акумулявацца ў нас. Нават у рамках дзеючай формы Указа ўсе, хто звернуцца да 6 жніўня ў выканкам з адпаведным пакетам дакументаў на атрыманне субсідыі, — будуць разгледжаныя», — растлумачыў Аляксандр Горваль.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*Kryzhevich@zviazda.by*

### ❍ У тэму

**• Тыя, хто жадае будаваць дамы і кватэры, будуць знаходіцца ў адной чарзе на адрасныя субсідыі. Пры гэтым фінансаванне будзе раздзельнае. Кожны год пастановай урада вызначаецца аб'ём дзяржпадтрымкі, якая пойдзе на шматкватэрнае і індывідуальнае жыллё. Калі чалавек, чыя чарга падышла, хоча будаваць жылы дом, то грошы ён будзе атрымліваць з рэсурсаў на індывідуальнае жыллё. Для тых, хто захоча будаваць кватэру, грошы будуць брацца з рэсурсаў на шматкватэрнае будаўніцтва.**

**• Атрымаць дзяржпадтрымку можна адзін раз. Але для шматдзетных сем'яў вызначана, што калі паўстала неабходнасць у паляпшэнні жыллёвых умоў у сувязі з нараджэннем яшчэ аднаго дзіцяці, то дзяржаўная падтрымка можа быць прадастаўлена паўторна. Гэта значыць, сям'я зноў становіцца на ўлік, прызнаецца незабяспечанай па нарматывах жылой плошчай.**

**• Субсідыі не распаўсюджваюцца на крэдыты, якія былі выдадзены раней. Указ №585 распаўсюджваецца толькі на шматдзетныя і маладыя сем'і. Прычым, для статусу «маладая сям'я» не абавязкова мець дзяцей. Аднак у такім выпадку Указ №585 не дзейнічае, паколькі згодна з ім субсідыя вылучаецца на дзяцей. Калі грамадзяне станавіліся на ўлік як маладая сям'я без дзяцей, а пазней дзеці з'явіліся, тады яны будуць мець права на атрыманне дапамогі ад дзяржавы.**

**• Каб маладая і шматдзетная сям'я магла прэтэндаваць на дапамогу па Указе №240, ёй варта ведаць, што прадастаўленне субсідыі будзе ажыццяўляцца па чарзе па аналогіі з Указам №13 (у другім выпадку — на выдачу льготных крэдытаў, у першым выпадку — на выдачу субсідый). Выканкам будзе глядзець чарговасць і пры наяўнасці кватэр, дамоў запрашаць грамадзян і прапаноўваць будаўніцтва. Гэта значыць, трэба мець неабходнасць у паляпшэнні жыллёвых умоў. Далей — пытанне малазабяспечанасці. Па Указе №13 толькі малазабяспечаным аказваецца падтрымка, у гэтым жа прававым полі працуе і Указ №240. Указ №585 улічваў толькі чарговасць.**

**• Каб паспець атрымаць дапамогу па Указе №585, маладым і шматдзетным сем'ям варта ведаць, што яны павінны стаяць у чарзе, пры гэтым пацвердзіць склад сям'і, прадставіць дакументы для атрымання фінансавай падтрымкі ў выканкам па месцы пастаноўкі на ўлік (дакументы: здача аб'екта, рэгістрацыя ў гэтым аб'екце, афармленне права ўласнасці на яго і іншыя). На якую дапамогу можна разлічваць? Маладым сем'ям пры наяўнасці аднаго непаўналетняга дзіцяці даецца 40 бюджэтаў пражытковага мінімуму (прыкладна 7,3 тыс. рублёў), сем'ям з двума дзецьмі — 80 бюджэтаў пражытковага мінімуму (амаль 15 тыс. рублёў), сем'ям з трыма дзецьмі — 100 бюджэтаў пражытковага мінімуму (амаль 18,5 тыс. рублёў).**


ТАБЛИЦА ПРОЦЕНТНЫХ СТАВОК ПО СРОЧНОМУ БАНКОВСКОМУ ВКЛАДУ (ДЕПОЗИТУ) «СИСТЕМА СБЕРЕЖЕНИЙ ЛИНИЯ РОСТА 2.0»

**с 18 августа 2017 года**

% годовых

| Сумма депозита, ед. валюты | до 6 месяцев (90–180 дней) | от 6 месяцев до 1 года (181–370 дней) | от 1 года до 2 лет (371–740 дней) | от 2 до 5 лет (741–2000 дней) |
|---|---|---|---|---|
| **Для договоров срочного банковского вклада (депозита) «Система сбережений Линия роста 2.0» в белорусских рублях, заключенных до 01.04.2016 года*** | | | | |
| 1 – 1 000 | **10,0** | **10,0** | **10,0** | **10,0** |
| 1 001 – 5 000 | **10,0** | **10,0** | **10,0** | **10,0** |
| 5 001 и более | **10,0** | **10,0** | **10,0** | **10,0** |
| **Для договоров срочного банковского вклада (депозита) «Система сбережений Линия роста 2.0» в белорусских рублях**** | | | | |
| 1–1 000 | **0,5** | **0,5** | **0,5** | **0,5** |
| 1 001–5 000 | **0,5** | **0,5** | **0,5** | **0,5** |
| 5 001 и более | **0,5** | **0,5** | **0,5** | **0,5** |
| **Для договоров срочного банковского вклада (депозита) «Система сбережений Линия роста 2.0» в долларах США и евро, заключенных до 25.11.2015*** | | | | |
| 1 – 500 | **3,3** | **3,5** | **4,1** | **4,5** |
| 501 – 5 000 | **3,4** | **3,9** | **4,3** | **4,5** |
| 5 001 и более | **3,5** | **4,0** | **4,5** | **4,5** |
| **Для договоров срочного банковского вклада (депозита) «Система сбережений Линия роста 2.0» в долларах США и евро, заключенных с 25.11.2015 до 01.04.2016*** | | | | |
| 1 – 500 | **3,3** | **3,5** | **3,8** | **4,0** |
| 501 – 5 000 | **3,4** | **3,6** | **3,9** | **4,0** |
| 5 001 и более | **3,5** | **3,7** | **4,0** | **4,0** |
| **Для договоров срочного банковского вклада (депозита) «Система сбережений Линия роста 2.0 в российских рублях, заключенных до 01.04.2016*** | | | | |
| 1 – 15 000 | **7,0** | **7,0** | **7,0** | **7,0** |
| 15 001 – 150 000 | **7,0** | **7,0** | **7,0** | **7,0** |
| 150 001 и более | **7,0** | **7,0** | **7,0** | **7,0** |
| **Для договоров срочного банковского вклада (депозита) «Система сбережений Линия роста 2.0» в долларах США, евро и российских рублях**** | | | | |
| 1 – 15 000 | **0,1** | **0,1** | **0,1** | **0,1** |
| 15 001 – 150 000 | **0,1** | **0,1** | **0,1** | **0,1** |
| 150 001 и более | **0,1** | **0,1** | **0,1** | **0,1** |

Настоящие ставки применяются:
* для договоров срочного банковского вклада (депозита) «Система сбережений Линия роста 2.0» за исключением случаев автоматического увеличения срока их хранения в соответствии с пунктом 3.7 Условий договора срочного банковского вклада (депозита) Система сбережений Линия роста 2.0» (далее – Условия)
** для договоров срочного банковского вклада (депозита) «Система сбережений Линия роста 2.0» в случаях автоматического увеличения срока их хранения в соответствии с пунктом 3.7 Условий.

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
время работы Контакт-Центра Банка
8.00 - 20.00 - рабочие дни
8.00 - 18.00 - выходные и праздничные дни
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) - по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.
белагропромбанк традиции будущего



ТАБЛИЦА ПРОЦЕНТНЫХ СТАВОК ПО СРОЧНОМУ БАНКОВСКОМУ ВКЛАДУ (ДЕПОЗИТУ) ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»

**с 18 августа 2017 года**

Вклады (депозиты) с плавающими процентными ставками
% годовых

| Сумма депозита, ед. валюты | Срок, дни 100 | 200 | 300 | 500 | 1 000 | 2 000 | 3 000 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Белорусские рубли*** | | | | | | | |
| 1 – 100 | **10,0** | **10,0** | **10,0** | **10,0** | **10,0** | **10,0** | **10,0** |
| 101 – 1 000 | **10,0** | **10,0** | **10,0** | **10,0** | **10,0** | **10,0** | **10,0** |
| 1 001 и более | **10,0** | **10,0** | **10,0** | **10,0** | **10,0** | **10,0** | **10,0** |
| **Доллары США, Евро*** | | | | | | | |
| 1 – 500 | 4,00 | 4,00 | 4,00 | 4,00 | 4,50 | 4,50 | 4,50 |
| 501 – 5 000 | 4,00 | 4,00 | 4,00 | 4,00 | 4,50 | 4,50 | 4,50 |
| 5 001 и более | 4,00 | 4,00 | 4,00 | 4,00 | 4,50 | 4,50 | 4,50 |
| **Российские рубли*** | | | | | | | |
| 1 – 15 000 | 6,00 | 6,00 | 6,00 | 7,00 | 7,00 | 7,00 | 7,00 |
| 15 001 – 150 000 | 6,00 | 6,00 | 6,00 | 7,00 | 7,00 | 7,00 | 7,00 |
| 150 001 и более | 6,00 | 6,00 | 6,00 | 7,00 | 7,00 | 7,00 | 7,00 |
| **Белорусские рубли**** | | | | | | | |
| 1 – 100 | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 |
| 101 – 1 000 | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 |
| 1 001 и более | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 | 0,50 |
| **Доллары США, Евро, российские рубли**** | | | | | | | |
| 1 – 500 | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 |
| 501 – 5 000 | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 |
| 5 001 и более | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 | 0,10 |

Настоящие ставки применяются:
* для договоров срочного банковского вклада (депозита) с переменными процентными ставками, заключенных до 01.09.2013, за исключением случаев автоматического увеличения срока их хранения в соответствии с пунктом 3.6 Условий срочного банковского вклада (депозита) ОАО «Белагропромбанк» (с переменной процентной ставкой), утвержденных решением Кредитного комитета ОАО «Белагропромбанк» от 16.02.2006, протокол №21 (далее – Условия);
** для договоров срочного банковского вклада (депозита) с переменными процентными ставками, заключенных до 01.09.2013, в случаях автоматического увеличения с 01.04.2016 срока их хранения в соответствии с пунктом 3.6 Условий.

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
время работы Контакт-Центра Банка
8.00 - 20.00 - рабочие дни
8.00 - 18.00 - выходные и праздничные дни
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) - по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.
белагропромбанк традиции будущего


ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## СТЫХІЯ. ДУБЛЬ ДВА

**Надвор'е на гэтым тыдні працягвае непрыемна здзіўляць. Не паспелі заходнія раёны Беларусі ачомацца ад наступстваў магутнага навальнічнага фронту, які «адзначыўся» моцным ветрам і падтапленнямі ў аўторак, як у чацвер адбыўся выступ стыхіі «на біс».**

Больш за ўсіх дасталася Навагрудскаму раёну. Там выпала 57 міліметраў ападкаў пры месячнай норме 91. Таксама «паплыло» Гродна. А ў Мінску вецер паваліў рэкламны шчыт на прыпаркаваны аўтамабіль. На шчасце, без пацярпелых.

— У Навагрудку моцны дождж падтапіў тры прыватныя дамы і восем падвор'яў, — паведамілі ў Гродзенскім абласным упраўленні Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. — Узровень вады там дасягаў 60 сантыметраў. Акрамя таго, у Гродне ўпалі тры дрэвы.

З-за шквалістага ветру без электрычнасці засталося 195 населеных пунктаў.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

## СВЯТА КЕРАМІКІ Ў БАБРУЙСКУ

**Днямі ў горадзе на Бярэзіне стартаваў XV Міжнародны пленэр па кераміцы «АРТ-Жыжаль», які традыцыйна пройдзе на базе адпачынку «Вербкі» гасцінічнага комплексу прадпрыемства «ФанДАК» і завершыцца 2 жніўня выніковай выставай у Бабруйскім мастацкім музеі. Як заўсёды ў адну з апошніх начэй гэтага амаль паўмесячнага свята адбудзецца чароўная падзея з абпальваннем галоўнай скульптуры пленэру.**

У мерапрыемстве прымаюць удзел 20 мастакоў-керамістаў з Беларусі, Расіі, Украіны, Латвіі, Літвы, Малдовы, Францыі і ўпершыню Індыі і ЗША. Тэма пленэру «Флора і фаўна» накіравана на раскрыццё ладу штучнай прыроды, створанай чалавекам горада. Ідэйны натхняльнік і кіраўнік гэтага свята Валерый Калтыгін звяртае ўвагу на тое, што бабруйскі пленэр керамікі ўнікальны па сваім паходжанні, бо часцей такія формы практыкуюць мастакі. Падобнага няма ў Еўропе, а па працягласці нават і ў Расіі.

## ТРАПІЛІ ПАД АРЫШТ...

...галоўны інжынер аднаго з камунальных прадпрыемстваў Бабруйска, якому за перавышэнне ўлады і службовых паўнамоцтваў пры закупцы вулічных апор вонкавага асвятлення пагражае ад трох да дзесяці гадоў пазбаўлення волі, канфіскацыя маёмасці і забарона пэўны час займаць некаторыя пасады.

— За кошт сродкаў мясцовага бюджэту ён набыў у магілёўскага таварыства з абмежаванай адказнасцю апоры на агульную суму 111,8 тысячы рублёў, хоць была магчымасць купіць іх непасрэдна ў вытворцы — Аршанскага будаўнічага трэста №18 за 66,4 тысячы рублёў, — паведаміў **намеснік начальніка ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК па Магілёўскай вобласці Аляксандр ШАРОЙКІН.** — Сваімі дзеяннямі ён нанёс дзяржаве шкоду ў асабліва буйным памеры — на суму больш за 45 тысяч рублёў.

...і шампіньёны, незаконнае перамяшчэнне якіх прыпынілі гомельскія і магілёўскія мытнікі. Затрыманы тры транспартныя сродкі, якія перавозілі звыш 55 тон грыбоў на агульную суму 200 тысяч беларускіх рублёў. Тавар канфіскаваны, па фактах распачаты адміністрацыйныя працэсы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# «ЗВЯЗДА» — ГЭТА ЎЖО ПАЖЫЦЦЁВА...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Гэту ганаровую місію «Звязда» па традыцыі давярае гасцям. Такім чынам

## МАНГАЛ FORESTER ВЫЙГРАЛІ:




**Мікалай Паўлавіч Юруць, г. Ляхавічы, Брэсцкая вобласць;**

**Ганна Чаславаўна Сугакова, г. Наваполацк, Віцебская вобласць;**

**Андрэй Фёдаравіч Дубадзелаў, в. Леніна, Добрушскі раён, Гомельская вобласць;**

**Ірына Іванаўна Кротава, г. Карэлічы, Гродзенская вобласць;**

**Уладзімір Іванавіч Таненя, п. Жылічы, Кіраўскі раён, Магілёўская вобласць;**

**Станіслаў Антонавіч Жыбуль, в. Плашава, Дзяржынскі раён, Мінская вобласць;**

**Таццяна Уладзіміраўна Гаральчук, г. Мінск.**

## СУПЕРПРЫЗ — НАБОР САДОВАЙ МЭБЛІ

**выйграў Васіль Мікітавіч ПЯШЭВІЧ, в. Юркевічы, Жыткавіцкі раён, Гомельская вобласць.**



Віншуем шчаслівчыкаў! І вельмі рады, што гэтым разам сярод іх не проста адданыя падпісчыкі, але і сапраўдныя сябры нашай газеты — любімыя аўтары. Ну, у прыватнасці, у рубрыку «Алё, народ на провадзе!» не раз дасылалі свае праўдзівыя гісторыі сужэнцы Гаральчукі, спадары Васіль Пяшэвіч і Мікалай Юруць...

Знаёмае чытачам і прозвішча Дубадзелавых з вёскі Леніна. Праўда, пісаў нам не Андрэй Фёдаравіч, а Дзіна Канстанцінаўна...

Прыемна было даведацца, што гэта — адна сям'я, што ў вёску Леніна яна перасялілася пасля катастрофы на Чарнобыльскай АЭС з Веткаўшчыны — з новага дома, які сужэнцы (двое сірот) да апошняга цвічка будавалі самі, сваімі рукамі (а пахавалі яго, разам з вёскай, чужымі...); што са «Звяздой» сябруюць вельмі даўно, і што яна прыходзіць да іх... праўдай.

— Выпісвалі мы некалі газету «Правда», — прыгадала Дзіна Канстанцінаўна. — Але ж на пачатку 90-х адмовіліся — перайшлі на «Звязду». І гэта, відаць, ужо пажыццёва. Падабаецца газета за родную мову, за «Крынічку» і «Жырандолю», за «Краіну здароўя», «Ігуменскі тракт» і, вядома ж, за «вясёлыя і праўдзівыя гісторыі».

Што, магчыма, цікава, пастаянна выпісваючы «Звязду», сужэнцы (дакладней, сам Андрэй Фёдаравіч Дубадзелаў) гэтак жа пастаянна дасылалі карткі на розыгрышы прызоў, але не выйгравалі, можна сказаць, нічога.

Ці рады мангалу?

«Ну вядома ж! — прызналіся шчаслівчыкі. — Двое дзяцей у нас, чацвёра ўнукаў і ўжо чацвёра праўнукаў. Дзякаваць Богу, любяць прыязджаць, асабліва летам. У нас ля хаты толькі руж, можа, з 30 сартоў... Так што ў гэтай прыгажосці і мангал дарэчы. Было б што смажыць! Ды каб яшчэ з добрым здароўем, у добрае надвор'е...

Так, сёлета яно не песціць: кажуць, маладзіца адна, пакуль дождж на дварэ, не хацела з хаты выходзіць: так прайшоў яе... чэрвень.

Але ж надзея на лета пакуль застаецца. А таму няхай ва ўсіх падпісчыкаў, чытачоў «Звязды» яно будзе цёплым, прыгожым і... смачным!

**АФІЦЫЙНА**

Арганізатарам рэкламнай гульні «Смачнае лета са «Звяздой» з'яўляецца рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (УНП 100155376), размешчаная па адрасе: вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А, 220013, г. Мінск.

Рэкламная гульня «Смачнае лета са «Звяздой» зарэгістравана Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь 16.05.2017 г. (пасведчанне №3002) і праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з 26 мая па 30 верасня 2017 года ўключна сярод падпісчыкаў газеты «Звязда» трэцяга квартала або другога паўгоддзя 2017 года. Усяго ў гульні ўзялі ўдзел 154 падпісчыкі. Прызавы фонд гульні разыграны цалкам.

Тэлефон для даведак па пытаннях правядзення рэкламнай гульні і атрымання прызоў: 8 (017) 377-44-04.

# ПРЫБРАЦЦА Ў ДВАРЫ І... УБАЧЫЦЬ КАЛІЗЕЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Сёння мы разглядаем розныя спосабы палепшыць працу жыллёва-камунальнай гаспадаркі, — расказаў **намеснік старшыні адміністрацыі Цэнтральнага раёна Вадзім ПЯРЭДНЯ.** — Важны вынік гэтага конкурсу заключаецца ў тым, што мы здолелі прыцягнуць да ўдзелу ў ім насельніцтва. У галасаванні прынялі ўдзел каля 500 чалавек, яны падтрымалі кандыдатаў, чыя праца сапраўды не выклікае пытанняў. Былі нават выпадкі, калі пенсіянеры, што не могуць прагаласаваць у інтэрнэце, самі прыходзілі ў адміністрацыю і прыносілі свае пісьмовыя пажаданні, якія прасілі ўлічыць пры галасаванні. Таксама атрымалася залучыць прыватны бізнес. Але галоўнае — мы змаглі зматываваць саміх работнікаў да якаснага выканання сваіх абавязкаў, можа быць, нават пачалі ствараць новы вобраз прафесіі дворніка. Нам хацелася б, каб астатнія раёны Мінска таксама падцягнуліся да правядзення падобных конкурсаў.

Па словах Вадзіма Пярэдні, праблемы з кадрамі ў сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі ў Цэнтральным раёне няма — штат укамплектаваны поўнасцю. Вакансіі калі і з'яўляюцца, то вельмі хутка закрываюцца. Гэтаму паспрыяў і допуск прыватных арганізацый да работы ў сферы ЖКГ. Такім чынам, з'явілася канкурэнцыя, а гэта стымулюе і кіраўнікоў дзяржаўных прадпрыемстваў удасканальваць сваю працу. Сярэдні заробак дворнікаў складае ад 400 да 450 рублёў. Цяпер стаіць задача яго павышэння.

Кульмінацыяй сустрэчы стала цырымонія лёсавання, падчас якой вызначаўся парадак наведвання конкурснай камісіяй участкаў канкурсантаў. Пасля гэтага дворнікаў пачаставалі спецыяльна прыгатаваным тортам.

— Насамрэч у прафесію я трапіла выпадкова, — падзялілася **рабочая па комплекснай прыборцы будынкаў і збудаванняў ЖЭС №27 Ніна ЛАМЕЙКА.** — Раней займала кіруючую пасаду на прадпрыемстве па вытворчасці адзення. Але трэба было адпачыць па стане здароўя, таму ўладкавалася дворнікам. Працую паўтара года, але магу сказаць, што мне так нідзе яшчэ не падабалася. Па-першае, я ў выдатнай фізічнай форме, знаёмыя пытаюцца: «Барысаўна, вы ў спартзалу ходзіце ці танцамі займаецеся?» Па-другое, працую на свежым паветры. Па-трэцяе, люблю размераннасць. Гэта не завод і не фабрыка, нікуды бегчы не трэба — выйшаў, спакойна адпрацаваў, і можна адпачываць. Галоўнае, я лічу, працаваць з задавальненнем, тады нічога не будзе раздражняць. Зіма? Нічога страшнага, людзі цяпер разумеюць, што гэта датычыцца ў першую чаргу іх саміх, таму многія па ўласнай ініцыятыве дапамагаюць. Увогуле, дворнік — гэта ж легендарная прафесія, з гісторыяй і сваёй аўрай — яго ўсе ведаюць, усе вітаюцца і, спадзяюся, шчыра паважаюць.



— Працую толькі паўтара года, але ў нашай сям'і гэта прафесія сапраўды дынастыйная — маці таксама працавала дворнікам, — дапаўняе яе **калега Святлана СТЭЛЬМАХ з ЖЭС №13.** — Чаму жыхары абралі на конкурс менавіта мяне? Магу толькі здагадвацца — я з усімі імкнуся сябраваць, калі бабулі трэба спусціцца па сходах — абавязкова дапамагу, потым пагутару з ёй. Калі казаць пра прафесійны аспект, то, думаю, мае заслугі можна раздзяліць з жыхарамі. «Чыста не там, дзе прыбіраюць, а там, дзе не смецяць» — фраза цалкам справядлівая. Конкурс «Найлепшы дворнік Цэнтральнага раёна» — выдатны стымул. Вядома, хочацца перамагчы, бо гэта і прызнанне, і, безумоўна, каштоўны прыз — мару з'ездзіць адпачыць з унукам.




Па словах старшыні адміністрацыі Цэнтральнага раёна Ігара Бузоўскага, першапачаткова планавалася правесці ўзнагароджанне каля помніка дворніку на вуліцы Карастаянавай. Але цяпер арганізатары схіляюцца да ідэі ўганаравання ў дварыпераможцы. Гэта будзе сімвалічна, а таксама стане прыкладам для іншых дворнікаў.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

белагропромбанк
традиции будущего

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
## на 1 июля 2017 г.

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО
«Белагропромбанк»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 01.07.2017 | 01.01.2017 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 136 721 | 136 576 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 278 | 271 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 629 634 | 308 605 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 376 107 | 372 004 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 3 462 796 | 2 947 359 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 4 400 374 | 4 990 234 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | - | 1 109 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 97 385 | 97 416 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 256 181 | 269 471 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | 9 761 | 10 001 |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | | 26 | 26 |
| 13 | Прочие активы | 1112 | | 124 461 | 135 538 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | | 9 493 724 | 9 268 610 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | | 1 339 | 2 007 |
| 17 | Средства банков | 1202 | | 1 336 370 | 1 400 026 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | | 5 466 929 | 5 750 608 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 891 532 | 872 131 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | 1 393 |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | 995 | 995 |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | | 41 242 | 27 022 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 7 738 407 | 8 054 182 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | | 1 238 352 | 707 970 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | | 100 935 | 100 110 |
| 28 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | | 132 865 | 133 673 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | | 283 165 | 272 675 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 1 755 317 | 1 214 428 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 9 493 724 | 9 268 610 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
## за январь–июнь 2017 года

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО
«Белагропромбанк»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 01.07.2017 | 01.07.2016 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 481 280 | 544 179 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 238 987 | 440 335 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 242 293 | 103 844 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 71 482 | 72 925 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 26 778 | 29 758 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 44 704 | 43 167 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 20 | 47 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 184 | 3 113 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 11 224 | 8 138 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | 2 919 | (3 374) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 161 117 | 41 870 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 29 058 | 14 734 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 145 455 | 103 159 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 10 531 | 11 147 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 13 299 | 13 493 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 2 512 | 5 709 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 10 787 | 7 784 |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | | - | - |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | | - | - |

Председатель Правления А. А. Лысюк

Главный бухгалтер М. А. Шаповалова

Дата подписания: «6» июля 2017 г.

Отчетность в полном объеме размещена на странице интернет-сайта ОАО «Белагропромбанк»: **http://www.belapb.by/rus/about/bank-activity/indexes/individualnaya-otchetnost-po-nacionalnym-standartam/quarterly-reporting/**

Лицензия на осуществление банковской деятельности №2 от 13 января 2017 года выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

www.belapb.by
ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

■ K@нтыненты

# ВУГАЛЬ НА ВЕЦЕР

## Чаму ЗША абвясцілі «энергетычную рэвалюцыю»?



**Тэма энергабяспекі Еўропы стала адной з ключавых на саміце G20, які праходзіць у Гамбургу. На форуме зноў праявіліся рознагалоссі, што ўзніклі паміж Еўропай і ЗША. Адным з ключавых пытанняў, якое выклікае супярэчнасці, з'яўляецца прыхільнасць Старога Свету Парыжскаму пагадненню па клімаце, подпіс пад якім Штаты нядаўна анулявалі. Яшчэ адзін важны аспект — імкненне Еўропы супрацьстаяць ціску Вашынгтона ў пытанні забеспячэння прыродным газам і нафтай. Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп недвухсэнсоўна заявіў аб імкненні «заняцца прасоўваннем амерыканскага прыроднага газу на рынак ЕС». Зусім не выпадкова і тое, што напярэдадні саміту G20 у Гамбургу кіраўнік Белага дома прыняў удзел у саміце краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, якія прайшоў у Варшаве. Эксперты назвалі гэты форум «самітам трох мораў» (Адрыятыка, Балтыка, Чорнае). Усе пералічаныя «пазлы» складаюцца ў адзіны малюнак, калі ўспомніць пра нядаўнюю заяву Трампа аб тым, што Вашынгтон пачынае «вялікую энергетычную рэвалюцыю». Чым выкліканы такія глабальныя «тэктанічныя зрухі»?**



## ТОЛЬКІ БІЗНЕС

Барак Абама імкнуўся захоўваць баланс паміж развіццём традыцыйнай і аднаўляльнай энергетыкі. Ён аслабіў забарону на экспарт нафты, пры ім была пачата маштабная здабыча сланцавага газу. Але разам з тым адміністрацыя Абамы прыклала нямала намаганняў да развіцця сонечнай і ветравой энергетыкі, скарачала здабычу карысных выкапняў, не спыняючыся перад сваркай з амерыканскім бізнесам. Напрыклад, план Абамы «Чыстая энергія» лічылі абвяшчэннем вайны вуглездабывальнай прамысловасці.

Аднак Дональд Трамп канчаткова парваў са спадчынай свайго папярэдніка. Наконт цяперашняй жорсткай арыентацыі на традыцыйныя крыніцы энергіі ў ЗША ніхто, напэўна, і не сумняваўся. Адметна, што менш чым за суткі, калі Трамп перамог на выбарах, каціроўкі вугальных і нафтавых кампаній ужо пайшлі ўверх. Напрыклад, акцыі Glencore, найбуйнейшага пастаўшчыка вугалю, выраслі на 7%. У той жа час акцыі Vestas Wind Systems, сусветнага лідара ў вытворчасці ветраных турбін, упалі адразу на 13%. У лістападзе, пасля абрання Трампа, Боб Макналі, прэзідэнт кансалтынгавай фірмы Rapidan Group і колішні старшы саветнік па энергетыцы пры прэзідэнце Джорджу Бушу-малодшым, заявіў: «Эпоха дэкарбанізацыі, якая была асноўным прынцыпам энергетычнай палітыкі Барака Абамы, скончылася мінулай ноччу».

Што датычыцца пазіцыі новага кіраўніка ЗША з нагоды глабальнага пацяплення, то яшчэ ў 2012 годзе ён заяўляў, што глабальнае пацяпленне з-за дзейнасці чалавека — міф. На думку Трампа, палітыка, нацэленая на зніжэнне ўзроўню вуглякіслага газу ў атмасферы, прыводзіць толькі да спаду прамысловай і аграрнай вытворчасці, але не дапамагае адтэрмінаваць глабальныя змены клімату. Таксама ён казаў, што Вашынгтону не варта абцяжарваць сябе экалагічнымі абмежаваннямі да таго часу, пакуль Кітай не накіне «зялёную аброць» на сваю прамысловасць. Інакш ЗША рызыкуюць апынуцца на эканамічнай абочыне свету.

Дональд Трамп мае намер зрабіць Штаты найбуйнейшым у свеце пастаўшчыком энерганосьбітаў. «Амерыка на парозе энергетычнай рэвалюцыі», — заяўляе цяпер прэзідэнт ЗША. І запэўнівае — рэсурсы проста велізарныя. «Запасаў прыроднага газу ў нас на сто гадоў, вугалю — на 250, мы можам стаць топ-вытворцам нафты і вытворцам нумар адзін у свеце — прыроднага газу», — кажа Дональд Трамп. Па яго словах, гаворка ідзе пра «мільёны працоўных месцаў і трыльёны долараў прыбытку для краіны». Пры гэтым прэзідэнт ЗША празрыста намякае: маўляў, дагэтуль пастаўкі нафты і газу выкарыстоўваліся некаторымі краінамі як палітычная зброя, але для Амерыкі гэта выключна бізнес-праект.

## «ЗАЛАТАЯ ЭРА»

Варта ўспомніць, што аж да канца Другой Сусветнай вайны і некалькі пазней ЗША былі найбуйнейшым экспарцёрам нафты, больш за тое, сусветным рэгулятарам, выходзячы на рынак з дадатковымі пастаўкамі ў выпадку недахопу. Гэта значыць, былі свайго роду Саудаўскай Аравіяй таго часу. Толькі потым амерыканцы вырашылі сваю нафту «збіраць» са стратэгічных і эканамічных меркаванняў. Але цяпер сітуацыя, падобна, змяняецца. Выступаючы на сустрэчы, арганізаванай Міністэрствам энергетыкі ЗША, кіраўнік Белага дома заявіў аб пачатку рэалізацыі новай энергетычнай палітыкі. «Мы будзем экспартаваць амерыканскія энерганосьбіты па ўсім свеце», — паабяцаў Трамп. Па словах прэзідэнта, гаворка ідзе пра пачатак «залатой эры» амерыканскага дамінавання. Сярод прыкладаў новага падыходу Трамп назваў планы павялічыць пастаўкі амерыканскага звадкаванага газу на азіяцкія рынкі, а таксама продаж вугалю на Украіну.

Як растлумачылі ў Белым доме, дамагчыся энергетычнага дамінавання мяркуецца за кошт багатых прыродных рэсурсаў. У распаўсюджанай з гэтай нагоды даведцы ўдакладнялася, што ў ЗША сёння на 20% больш нафты, чым у Саудаўскай Аравіі (агульным коштам звыш $13 трлн пры сярэднім узроўні цэн у $50 за бараль), краіна мае маштабныя запасы прыроднага газу, а таксама другія па велічыні запасы вугалю ў свеце.

Кіраўнік Белага дома заявіў, што яго адміністрацыя разглядае ідэю абнаўлення праграмы развіцця атамнай энергетыкі, якая павінна скласці канкурэнцыю прыроднаму газу і аднаўляльным крыніцам энергіі. Яшчэ адзін пункт праграмы — распрацоўка новых радовішчаў нафты і газу на амерыканскім шэльфе. Работы былі замарожаныя пры адміністрацыі Барака Абамы. Указ аб пашырэнні здабычы на шэльфе Трамп падпісаў яшчэ ў канцы красавіка. Ён растлумачыў гэта ў тым ліку стварэннем тысяч новых працоўных месцаў для грамадзян ЗША. Як раней паведамлялі аналітыкі, праграма здабычы на шэльфе носіць доўгатэрміновы характар і не павінна аказаць істотнага ўплыву на нафтавыя цэны ў найбліжэйшай перспектыве. Тлумачыцца гэта тым, што для пачатку трэба правесці дадатковую разведку. Акрамя таго, працягвае расці здабыча ў Мексіканскім заліве, дзе амерыканскія кампаніі арандавалі радовішча.

## З'ЕСЦІ 28 «ПАРСЮЧКОЎ»

Пра будучае дамінаванне ў сусветнай энергетыцы заявіў і міністр энергетыкі ЗША Рык Пэры. Цяпер у Вашынгтоне сцвярджаюць, што мясцовыя вытворцы могуць працаваць і пры $25 за бараль. Напрыклад, як паведаміла агенцтва Bloomberg, пра гэта заявіў старшыня савета дырэктараў Pioneer Natural Resources Скот Шэфілд. Паводле яго слоў, кампаніі, якія працуюць у Пермскім басейне, будуць атрымліваць прыбытак, нават калі кошт нафты ўпадзе да адзнакі $25 за бараль.

Вядучы аналітык расійскага Фонду нацыянальнай энергетычнай бяспекі Ігар Юшкоў лічыць, што ЗША сапраўды могуць выкарыстоўваць энергетыку ў якасці геапалітычнай зброі, паколькі ім, у першую чаргу, неабходна дамінаванне і атрыманне максімальных прыбыткаў, што, уласна, і абяцае Дональд Трамп. Галоўная мэта — стварыць дэфіцыт газу на еўрапейскім рынку. Тады цэны вырастуць і стане рэнтабельна пастаўляць амерыканскі звадкаваны прыродны газ (ЗПГ) у краіны ЕС, аб чым кажа эксперт.

У рэалізацыі сваіх планаў Вашынгтон спрабуе выкарыстаць Польшчу ў якасці свайго галоўнага лабіста. «Польшча з'яўляецца краінай, якая можа выконваць ролю своеасаблівага хаба для ўдзелу ЗША на ўсходнім флангу, асабліва ў пытаннях энергабяспекі», — заявіў кіраўнік Бюро нацыянальнай бяспекі (BBN) Польшчы Павел Солах. Як вядома, у пачатку мінулага месяца першыя танкеры з амерыканскім ЗПГ ужо прыбылі ў Польшчу і Нідэрланды. «Злучаныя Штаты пачалі рэгулярныя пастаўкі звадкаванага газу ў Паўночную Еўропу, забяспечваючы дыверсіфікацыю пастаўшчыкоў газу і энергетычную бяспеку Еўропы», — урачыста абвясціў міністр энергетыкі ЗША. Паводле яго слоў, Стары Свет нібыта разглядае Штаты як патэнцыйную ключавую крыніцу энергетычнай дыверсіфікацыі — з мэтай зніжэння ўплыву Расіі як галоўнага пастаўшчыка энергарэсурсаў у гэты рэгіён.

Незадаволенасць Трампа Парыжскім пагадненнем у Еўропе, як аказалася, не падзяляе ніхто. Яно і зразумела. Краіны ЕС уклалі занадта шмат сродкаў у «зялёную энергетыку», каб так проста ад яе адмаўляцца. «З-за рашэння ЗША выйсці з Парыжскага пагаднення па клімаце, паміж партнёрамі па Вялікай дваццатцы намеціліся рознагалоссі, — заявіла канцлер Германіі Ангела Меркель, — але ЗША застаюцца важным гульцом, таму мы зробім усё магчымае, каб працаваць з імі поплеч, хоць і не збіраемся закрываць вочы на нашы адрозненні».

Намеснік дырэктара ФНЭБ Аляксей Грывач лічыць, што Штаты можна параўнаць з «ваўком», які маскіраваўся авечай шкурай, а цяпер скінуў яе. «І збіраецца з'есці 28 еўрапейскіх «парсючкоў», якія слухалі словы «ваўка» пра тое, як ён клапоціцца аб еўрапейскай энергетычнай бяспецы, дыверсіфікацыі і развіцці канкурэнтнага рынку», — іранічна заўважыў эксперт.

## КОЛЬКІ ДА ПЕРАЛОМУ?

Сітуацыя ў Азіі больш складаная, бо на Кітай і Японію цяжка ціснуць. «Таму Вашынгтон іншым спосабам выціскае канкурэнтаў-пастаўшчыкоў», — кажа Ігар Юшкоў. Ён адзначае, што галоўнымі апанентамі ЗША ў рэгіёне сталі Расія і Катар. «Блакада Катара адбылася адразу пасля візіту ў Саудаўскую Аравію Дональда Трампа, і канфлікт на Блізкім Усходзе можа згуляць на руку Вашынгтону, — кажа вядучы аналітык ФНЭБ. — Сёння Катар з'яўляецца найбуйнейшым пастаўшчыком ЗПГ у Азію».

Эксперт мяркуе, што далейшая палітыка Вашынгтона заключаецца ў тым, што ён можа пачаць дэстабілізацыю і ў іншых здабыўных краінах. «Напрыклад, у Алжыры, які з'яўляецца адным з найбуйнейшых крыніц газу для ЕС», — кажа Ігар Юшкоў. Такім чынам, мяркуе эксперт, Вашынгтон будзе зачышчаць рынкі збыту ад пастаўшчыкоў, без чаго амерыканскае энергетычнае дамінаванне можа не атрымацца. Белы дом спасылаецца на звесткі аб тым, што дамінаванне на рынку газу прынясе да 2040 года $1,6 трлн. Праўда, толькі амерыканскай эканоміцы.

Між тым сусветны трэнд відавочны: летась адзначаны рэкордны рост аднаўляльнай энергетыкі. У сонечнай і ветраэнергетыцы разам узятых за год было пабудавана не менш за 140 ГВт новых магутнасцяў (для параўнання: гэта больш, чым уся электраэнергетыка Бразіліі). У фотаэлектрычнай сонечнай генерацыі на працягу мінулага года ўведзена ў дзеянне каля 76 ГВт — нябачаны дагэтуль аб'ём. А вызначаная магутнасць глабальнай сонечнай энергетыкі перавысіла 300 ГВт. Дарэчы, і ў ЗША летась сонечная энергетыка таксама пабіла ўсе ранейшыя рэкорды і заняла першае месца па прыросце ўсталяванай магутнасці (14 ГВт за год), апярэдзіўшы і газавую, і ветраную генерацыі, не кажучы пра іншыя спосабы вытворчасці электрычнасці. Аднаўляльныя крыніцы энергіі развіваюцца хутка, але пакуль не здольныя сур'ёзна пацясніць нафту, газ і вугаль, якія яшчэ доўга будуць адыгрываць вядучую ролю ў сусветным энергабалансе. Карэнны пералом у энергетыцы, па прагнозах аналітыкаў, адбудзецца ў 2040—2050 гадах.

**Захар БУРАК.** *burak@zviazda.by*

ПЛАЦДАРМ
Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь
Выпуск №7 (70)



■ Узброеным Сілам — 100 гадоў

Камандзір роты ганаровай варты — пра мару стаць вайскоўцам, кастынг у адно з элітных падраздзяленняў беларускай арміі і нацыянальную «кветку» пляц-канцэрта

# У ДУЭЦЕ З КАРАБІНАМ

**На яго раўняецца больш чым сотня чалавек, за дзеяннем якіх назіраюць кіраўнікі дзяржаў і ўрадаў, а часам — уся краіна. Замежныя госці захапляюцца выпраўкай гэтых салдат, а дзяўчаты не былі б супраць бачыць сярод іх сваіх жаніхоў. У роце ганаровай варты марыць служыць ледзь не кожны юнак. І не дзіва: гэтыя прыгожыя як на падбор хлопцы заўсёды ў цэнтры найважнейшых дзяржаўных падзей — не выпадкова эліта Узброеных Сіл!**



Кіраваць «візітнай карткай» краіны, як яшчэ называюць роту, надзвычай адказна. Зрабіць так, каб страявым майстэрствам салдат захапляліся не толькі беларусы, а іншаземцы пераймалі вопыт — задача не з простых. Але ўжо на працягу пяці гадоў камандзір падраздзялення з ёй выдатна спраўляецца.

Як яму гэта ўдаецца, карэспандэнты «Звязды» даведаліся з першых вуснаў. Пакуль ваеннаслужачыя роты ганаровай варты адточвалі складаныя тэхнічныя элементы, Павел Шпарла расказаў пра мару стаць афіцэрам, тонкасці «службы ў белых пальчатках» і нават прадэманстраваў некалькі ўнікальных трукаў, якія па сілах толькі салістам-віртуозам.

## Не здрадзіў мары

Насіць пагоны Павел марыў з самага дзяцінства. Вайскоўцаў у сям'і ніколі не было. Калі не лічыць прадзеда Міхаіла Казадоя, які браў Берлін, змагаўся з Квантунскай арміяй на Далёкім Усходзе.

Усур'ёз задумаўся над будучай прафесіяй, калі бавіў час са сваім суседам, курсантам Ленінградскага мараходнага вучылішча. Апошні прыязджаў да сваёй бабулі ў Пружаны і настолькі заразіў Паўла морам, што той вырашыў таксама там вучыцца. Але акурат у той год набор для беларускіх грамадзян адмянілі. Хлопец, вядома, засмуціўся, але мары не здрадзіў: сабраў дакументы — і паехаў у Мінск, у Ваенную акадэмію. І паступіў!

— У 16 гадоў пакінуць бацькоўскі дом і з'ехаць у вялікі горад, дзе ў цябе няма знаёмых, было не страшна, — прызнаецца Павел Шпарла. — У Пружанах я рос у прыватным сектары, таму мы, дзеці, ніколі не былі прывязаны да бацькоў: увесь вольны час праводзілі вялікай кампаніяй на вуліцы. Многія хлопцы, якія вучыліся ў акадэміі, таксама нарадзіліся ў невялікіх гарадах, таму мы вельмі хутка знайшлі агульную мову.

Цікава, што Паўлаў выбар паўплываў на прафесію яго старэйшага брата. Дагэтуль той насіць пагоны не планаваў, але, скончыўшы Мінскі дзяржаўны вышэйшы авіяцыйны каледж (цяпер — Беларуская дзяржаўная акадэмія авіяцыі), пайшоў служыць у армію па кантракце. Зараз ён камандзір батарэі, маёр — як і малодшы брат.

— Бацькі, напэўна, ганарацца сваімі сынамі? — пытаюся, прадчуваючы адказ.

— Асабліва мама: яна заўсёды хацела, каб мы сталі вайскоўцамі, — кажа Павел. — Як і любой жанчыне, ёй падабаецца вайсковая форма. Акрамя таго, мама захапляецца літаратурай і фільмамі на ваенную тэматыку. Адным словам, яе мара збылася!

## Хочаш у роту — прайдзі кастынг

Паколькі Паўлаў сябар (той, які вучыўся ў мараходцы) быў карабельным артылерыстам, прафесію «багоў вайны» выбраў і ён. Толькі ў артылерыйскіх войсках не праслужыў ні дня. Лёс вырашыў інакш.

— Пасля заканчэння Ваеннай акадэміі мяне запрасілі ў роту ганаровай варты, — расказвае камандзір. — Падчас вучобы тры парады я адхадзіў правафланговым першай шарэнгі, бачыў выступленні роты ганаровай варты. Таму, калі яе прадстаўнікі прыехалі ў акадэмію для адбору кандыдатаў, у мяне нават не было сумнення — я хацеў там служыць.

Але аднаго жадання, каб трапіць у эліту Узброеных Сіл, недастаткова. Прайсці кастынг па сілах не кожнаму. Мала мець рост ад 185 да 192 сантыметраў і прывабную знешнасць без шрамаў і татуіровак на бачных месцах. Ваеннаслужачы роты ганаровай варты павінен быць фізічна падрыхтаваным, дасканала валодаць страявой падрыхтоўкай. Акрамя таго, ні адзінага правапарушэння! Нават неаплачаны калісьці праезд у гарадскім транспарце можа назаўжды перакрэсліць кар'еру.

Адзін з усяго курса Павел трапіў у роту. Па першым часе камандаваў узводам, апошнія пяць гадоў узначальвае воінскае падраздзяленне. Сёння ён сам праводзіць кастынгі і прызнаецца, што патрэбную кандыдатуру не так проста знайсці.

— Але гэта не значыць, што мала ахвотных, — удакладняе камандзір. — Адносна нядаўна кіраўнік дзяржавы падпісаў указ, згодна з якім ваеннаслужачыя роты ганаровай варты пасля заканчэння службы маюць права па-за конкурсам паступаць як у сярэднія спецыяльныя, так і ў вышэйшыя навучальныя ўстановы краіны. Гэты факт, безумоўна, паўплываў на тое, што многія прызыўнікі хочуць служыць у нас.

## Камандзір — і таварыш, і бацька

Як і любому прызванаму салдату, Паўлу прыйшлося з нуля асвойваць прыёмы з карабінам і шашкамі. У Ваеннай акадэміі іх рыхтавалі дзеля таго, каб яны вучылі салдат, а тут выйшла наадварот. Але камандзір упэўнены: толькі пабываўшы на месцы звычайнага вайскоўца роты, ён адчуў, на што здольны салдат гэтага ўнікальнага падраздзялення. Павел і цяпер прытрымліваецца такога прынцыпу — у страі быць такім жа, як і ўсе. Як толькі выступленне ці заняткі заканчваюцца, ён для іх зноў камандзір.

Павел не нашмат сталейшы за сваіх падначаленых. Калі прыйшоў сюды лейтэнантам, большасць вайскоўцаў роты ўвогуле былі старэйшыя за яго. Праўда, падыход знайшоў адразу.

— Неабавязкова начальнік павінен пасябраваць са сваімі падначаленымі, — лічыць маёр. — Ён павінен паставіць жыццё ў падраздзяленні такім чынам, каб слова камандзіра было законам для салдат. У той жа час вайскоўцы павінны быць упэўнены, што гэтае слова іх ніколі не пакрыўдзіць, што яны абароненыя, што камандзір пра іх клапоціцца.

Часам здзіўляешся вытрымцы ваеннаслужачых роты ганаровай варты. Па некалькі гадзін — няважна, спякотна ці на дварэ 30-градусны мароз — яны нерухома стаяць у каравуле. Як перакананы Павел, сакрэт у рэгулярных трэніроўках. А калі ёсць неабходнасць (перад тым жа парадам), то адточваюць сваё майстэрства вайскоўцы і без выхадных, і ноччу, нават у любое надвор'е.

Кожныя паўгода ў роце — новыя салдаты. Каб выконваць найпрасцейшыя задачы, дастаткова два месяцы навучання. Калі размова ідзе пра работу ў разліках, патрэбна не менш чым паўгода. Амаль год трэніруюцца тыя, хто трапляе ў пляц-канцэрты.

— А не прасцей прызываць у роту ваеннаслужачых па кантракце? — цікаўлюся. — Толькі юнакі ў дасканаласці авалодалі прафесіяй, як прыходзіць час развітвацца...

— Калі было б іначай, абавязкова пачалося б непаразуменне ў калектыве: салдаты-кантрактнікі, як лепш падрыхтаваныя, ленаваліся б, магчыма, выхваляліся б, што ўмеюць больш, чым навічкі, — перакананы Павел. — Няўжо чакаць, пакуль апошнія дасягнуць іх узроўню майстэрства? А як жа самаразвіццё? Вядома, складаней вучыць наноў, але тым цікавей.

— Ці моцна злуецца камандзір, калі падчас важных выступленняў здараюцца памылкі?

— Я не злуюся, а думаю над тым, як гэта можна выправіць, — удакладняе Павел. — Памылкі ў асноўным адбываюцца з-за таго, што салдаты моцна хвалююцца. Многія родам з невялікіх гарадоў, нават вёсак, яны і ў Мінску не ўсе былі, а тут — парад: на іх глядзяць тысячы людзей, сам Прэзідэнт! Таму я думаю пра тое, як іх падбадзёрыць, настроіць на работу, каб нават думкі пра хваляванне не ўзнікла.

## Здзіўляючы ўвесь свет

Рота ганаровай варты на працягу многіх гадоў упрыгожвае ваенныя парады, якія ладзяцца ў Мінску на Дзень Незалежнасці, а ў юбілейныя гады — на Дзень Перамогі. Найскладанейшыя тэхнічныя элементы з карабінамі і шашкамі выконваюцца пад акампанемент зводнага аркестра — не выпадкова гэтае выступленне вайскоўцаў называюць канцэртам на пляцы.

Нягледзячы на тое, што публічна Павел ужо некалькі гадоў як не выконвае страявыя элементы, карабінам і шашкай ён валодае па-ранейшаму дасканала. Карэспандэнты «Звязды» ў гэтым пераканаліся падчас адной з трэніровак роты. З лёгкасцю карабінам Сіманава, які, між іншым, важыць каля чатырох кілаграмаў, Павел выконвае няхітрыя трукі, спрытна выпісвае піруэты шашкамі.

Штогод для галоўнага свята краіны рота ганаровай варты рыхтуе прынцыпова новы пляц-канцэрт. Сярод знаёмых гледачам элементаў — «расчоска», «даміно», «кветка», «мясарубка» — абавязкова прысутнічаюць новыя страявыя прыёмы. Іх аўтарамі, па словах камандзіра роты, з'яўляюцца самі вайскоўцы. Ну і, безумоўна, ён — але пра гэта Павел сціпла маўчыць.

— Ніякіх спецыяльных падручнікаў па вывучэнні элементаў для выступленняў роты ганаровай варты няма, — расказвае Павел Шпарла. — Ёсць толькі фантазія і інтэрнэт, каб паглядзець на пляц-канцэрты аналагічных падраздзяленняў іншых краін свету. Але паглядзець — не значыць поўнасцю паўтарыць.



Віртуозна валодаць карабінам і шашкай камандзір роты ганаровай варты вучыць на ўласным прыкладзе.

Дарэчы, ёсць чаму і замежнікам павучыцца ў калег-беларусаў. Яны адзначаюць надзвычай высокі тэмп выканання прыёмаў нашымі салдатамі і з задавальненнем бяруць некаторыя элементы на ўзбраенне. Напрыклад, папулярнасцю карыстаецца чыста беларускі — «кветка». Аб тым, што майстэрства вайскоўцаў роты ганаровай варты заслужыла высокую ацэнку і прызнанне міжнароднага гледача, сведчаць іх рэгулярныя выступленні на ўрачыстых мерапрыемствах за межамі нашай дзяржавы.

## Жонка служыць дапамагае

Камандзір роты ганаровай варты дома амаль не бывае. Ён жа не толькі вучыць сваіх салдат віртуознаму аваладанню карабінам ды шашкай. Павел адказвае не толькі за трэніроўкі, але і за самападрыхтоўку, побыт салдат. Ды і ў святы рэдка ўдаецца адпачыць: у асноўным для яго гэта працоўныя будні.

Як прызнаецца Павел, жонка да службы не раўнуе. Яна быццам сама служыць у роце ганаровай варты. Вось і падчас апошняй генеральнай трэніроўкі перад парадам (у той вечар горад проста залівала) была побач з мужам — як і ўсе, прамокла да ніткі.

— Жонка па магчымасці прысутнічае на кожным выступленні роты ганаровай варты, — расказвае Павел Шпарла. — Уважліва сочыць за пляц-канцэртам, а потым дзеліцца сваімі ўражаннямі. Можа пакрытыкаваць, сказаць, што ёй не спадабалася. Я, вядома, рэдка прыслухоўваюся, але часам не перашкодзіла б: за столькі гадоў маёй службы, здаецца, яна ўжо ў многім разбіраецца.

Гэты парад Вольга глядзела з асаблівым хваляваннем. Для яе мужа ён быў апошні. Прынамсі, у якасці камандзіра роты ганаровай варты. Неўзабаве Павел Шпарла ўступіць у новую пасаду — будзе выкладаць ваенную навуку ўжо на ваенным факультэце Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Сваім курсантам ён абавязкова раскажа пра службу ў роце ганаровай варты: магчыма, каторы юнак калісьці паўторыць яго шлях.

— Служба ў роце — гэта школа для далейшага жыцця, — кажа на развітанне Павел. — Я ўдзячны лёсу, што ён зрабіў мне такі падарунак.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*
**Фота Надзеі БУЖАН**



Каб выступіць з пляц-канцэртам падчас парада, патрэбен год трэніровак.



Парадную форму перад важнымі выступленнямі вайскоўцы рыхтуюць самі. Не выключэнне — і камандзір.

■ Векапомнае

# НАМ БУРЫ НЕ СТРАШНЫ...

**Працую над успамінамі партызанскага камандзіра 1-й Беларускай кавалерыйскай брыгады Дзмітрыя Анісімавіча Дзенісенкі, больш вядомага сярод партызан як смелы атаман Міцька.**

У поле майго зроку нечакана трапіла аматарская паэма мясцовай дзяўчыны-партызанкі Любы Перавоз. Называецца твор «Мая шчырая думка пра таварыша камандзіра Міцьку». Вершы напісаны адным вераснёўскім днём 1943 года ў вёсцы Пагарэлка, што ў Карэліцкім раёне. У паэме — 24 чатырохрадкоўі.

Расшыфроўваючы словы, прыйшла да высновы, што ў партызанскай друкаванай машынцы адсутнічала беларуская літара «і». Але не толькі з-за гэтай прычыны не ўсе словы зразумелыя. Сярод тых, якія ўдалося расшыфраваць, шмат русізмаў. Галоўнае, што падкупляе, напісана шчыра, з пачуццём, ёсць мастацкі вобраз партызана — Сокал. Адчуваецца, юная партызанка, медсястра Люба Перавоз, валодала паэтычным густам, рытмам, тэхнікай вершаскладання. Пераканайцеся самі.

***1.** Хоць цёмныя хмары*
*павіслі над намі*
*І буры так часта бушуюць у нас,*
*Нам буры не страшны,*
*бо мы ўсе ...*
*Што пройдуць і сонца засвеціць*
*для нас.*

***4.** Ды колькі разоў намагаўся*
*ўжо вораг,*
*Каб Сокалу быстры палёт*
*устрымаць,*
*Каб вырваць з грудзей*
*яго пылкае сэрца,*
*І вольныя крылы яго паламаць.*

***16.** За гэта вораг*
*над намі памсціўся,*
*І страшныя меры над намі прыняў,*
*Спаліў нашы сем'і,*
*спаліў нашы вёскі,*
*Кароўкі і хлеб наш*
*ад нас ён адняў.*

***17.** Но гэтым ён нас не ўстрашыў,*
*а толькі*
*У грудзях нашых помсты*
*агонь распаліў,*
*І мсціцца да смерці*
*за родныя сем'і*
*У душы не адзін з нас прысягу*
*злажыў.*

***23.** Ты дальняга ўсходу цудоўная*
*кветка,*
*прынесена страшнай*
*бурай вясны,*
*Ты ў бурах не згінуў,*
*у нашых абшарах расцвіў,*
*Як сірэнь з прыходам вясны.*

Цікава, як далей склаўся лёс гэтай дзяўчыны? Са слоў жыхаркі вёскі Ярэмічы, вясковай настаўніцы Ганны Уладзіміраўны Бандарык вядома, што пасля «партызанкі» Люба Перавоз была прызвана ў дзеючую армію. Перамогу сустрэла ў Берліне. Пасля вайны вучылася на курсах медсясцёр, выйшла замуж і з'ехала ў Днепрапятроўск. На гэтым яе сляды губляюцца.

Арыгінал вершаў — два пажоўклыя ад часу аркушы, унізе першага друкаванымі літарамі пазначана: «Працяг на адвароце!» — захоўваецца ў Навагрудскім гісторыка-краязнаўчым музеі. Але і яго супрацоўнікам невядома пра пасляваенны лёс дзяўчыны.

Магчыма, хтосьці з чытачоў «Звязды» калі не быў знаёмы з Любай Перавоз з вёскі Пагарэлка Карэліцкага раёна, дык хоць нешта чуў пра яе. Або, прачытаўшы гэтыя няхітрыя чатырохрадкоўі, нешта прыгадаў? Будзем удзячны, калі знойдуцца яе сваякі, таварышы — і новыя звесткі дапоўняць адну з тысяч невядомых партызанскіх біяграфій.

**Ірына ШАТЫРОНАК,** *г. Гродна*

■ Абеліскі параненай зямлі

# Апошні бой Мішы

## Дагэтуль невядома, ці ёсць у юнага героя-партызана магіла

**Падчас Вялікай Айчыннай вайны ў партызанскіх атрадах разам са сталымі мужчынамі адважна змагаліся і зусім юныя хлопцы. Жыццё прымусіла іх рана пасталець. Дарослым не па гадах стаў і пятнаццацігадовы Міша Усоскі, які загінуў у няроўным баі на пераправе цераз раку Цна ў Лагойскім раёне.**

### ПОМСЦІЎ ЗА БАЦЬКУ

Недалёка ад вёскі Іканы, што на Барысаўшчыне, да вайны знаходзілася Новае Сяло — родная вёска Мішы, якую ў маі 1943 года разам з жыхарамі спалілі фашысты. Сёння там стаіць помнік, які сведчыць, што ў гэтым месцы нарадзіўся і вырас юны герой.

Калі ў першыя месяцы акупацыі каля возера Палік з'явіліся партызаны, Міша з бацькам адразу сталі ім дапамагаць. За сувязь з партызанамі Апанас Усоскі быў арыштаваны на пачатку 1942 года: у Барысаве яго расстралялі. Бясстрашны Міша помсціў за бацьку. У складзе спачатку партызанскага атрада, а потым брыгады «Дзядзькі Колі» хлопчык выконваў даручэнні партызанаў па разведцы, збіраў зброю. Удзельнічаў у аперацыі і па разгроме нямецкага гарнізона ў Зембіне. 6 снежня 1942 года партызаны напалі на добра ўмацаваны гарнізон ворага і з боем захапілі шэраг важных будынкаў: спалілі гараж з аўтамашынамі, склад з бензінам, складскія памяшканні. Падчас бою было забіта шмат немцаў і паліцаяў, захоплены боепрыпасы.

Сёння яшчэ жывуць тыя, хто асабіста ведаў Мішу Усоскага. Юны змагар быў земляком жыхара Зембіна Васіля Ігнатовіча. Ён і цяпер памятае юнака, што быў маладзейшы за яго.

— Мы разам у адной школе вучыліся, — кажа былы партызан брыгады «Дзядзькі Колі». — Памятаю яго сям'ю: бацьку, маці, сястру Ксенію. Апанас Усоскі яшчэ ў грамадзянскую вайну партызаніў. Насіў ордэн Чырвонага Сцяга, заўсёды выступаў на сходах. Да вайны быў старшынёй мясцовага калгаса «Пралетарская перамога». Ведаю, што Міша загінуў на пераправе цераз Цну — там шмат партызанаў загінула тады. Яны перапраўляліся, а ён адстрэльваўся да апошняга. У тым жа месцы яго потым і пахавалі, калі вярнуліся пасля блакады.

Жыхарка вёскі Іканы Марыя Верхаводзька ў гады вайны жыла ў Новым Сяле. Вось што яна расказвае пра той час: «Выхоўвала Мішу мая родная цётка Настасся. Маці хлопчыка памерла праз два тыдні пасля родаў, і яго бацька Апанас узяў замуж маю цётку. Вёска вялікая была — усю спалілі немцы, 143 чалавекі загінулі... Калі пачалася вайна, яны з Мішам збіралі зброю і дапамагалі партызанам. Немцы Апанаса арыштавалі і павезлі ў Барысаў: больш яго ніхто не бачыў. Сястра Мішы, Ксенія, была за яго старэйшая. Калі бацьку забіралі, яна вельмі спалохалася і захварэла — сухоты мучылі. Фельчар з Карсакавіч яе лячыў, але нічога не дапамагло, і яна хутка памерла. Найбліжэйшы атрад да нас быў «Бура», туды і пайшоў Міша ў партызаны. Да нас яны кожную ноч прыходзілі: хлеб ім пяклі ўсёй вёскай».

### НА ПЕРАПРАВЕ

Гэты бой, які абарваў жыццё пятнаццацігадовага хлопчыка, адбыўся на рацэ Цна, на Лагойшчыне. Карнікі прачэсвалі ўсю тэрыторыю, уключаючы лясы і балоты, суцэльнымі ланцугамі выцяснялі партызанаў у раён возера Палік, дзе і збіраліся знішчыць іх у балоце.

Трагічныя падзеі таго дня іх непасрэдны сведка, жыхар вёскі Ліпкі Уладзімір Касабука памятае дагэтуль: «На гары каля маяка партызаны назіралі за немцамі. Неўзабаве адзін прыбег і далажыў камандзіру, што вораг наступае. Партызаны збіраліся да пераправы, але камандзір даў ім каманду заняць абарону на гары перад вёскай і трымаць бой. Мы ў вёсцы як пачулі, што немцы ідуць, адразу ж пабеглі на пераправу. Моста там ужо не было — партызаны спалілі. Па кладках цераз Цну мы ўсёй вёскай паспелі пераправіцца на другі бераг, адтуль за ўсім і назіралі. Дзесьці праз гадзіну пачалася стральба. Доўга трымаць бой партызаны не маглі, яны злезлі з гары і пабеглі наўпрост праз балота да кладак. Толькі немцы іх апярэдзілі. На гусенічнай танкетцы і матацыклах яны пад'ехалі да пераправы па грэблі, спыніліся на насыпе і пачалі страляць з мінамётаў і кулямётаў па партызанах. Апошнім не было куды дзявацца: убачыўшы, што немцы іх акружылі, яны пайшлі праз сенажаць да ракі.

Пліса Федзюковіча тут знаходзілася, як мы завём гэта месца. Рака тады была не вельмі глыбокая, але гразкая. Партызаны перапраўляліся, а немцы страчылі па іх з кулямётаў. Многіх забілі на другім беразе. Урач Тося перавязвала Паліну Войцэх — загінулі абедзве. Некаторыя не ўмелі плаваць і патанулі. Потым калі мы вярнуліся сюды, то ўбачылі дваіх забітых партызанаў і дзяўчыну, якія ляжалі на беразе пад кустом. Казалі, што яны падарваліся... Драніца Мікалай скокнуў у раку, а тужурка ўчапілася за кулямёт і закруцілася вакол галавы: ён так і не змог выплыць... Калі блакаду знялі, мы вярнуліся ў Ліпкі. Вёска была спалена. З ракі павыцягвалі загінулых і ўсіх (а гэта прыкладна 12 чалавек) тут жа на беразе і пахавалі. Пасля вайны яны былі перапахаваны ў брацкай магіле на вясковых могілках у Слабадзе».

Сёння на гэтых могілках — два брацкія пахаванні. Там напісаны прозвішчы загінулых партызанаў з атрада імя Гастэлы брыгады «Дзядзькі Колі». На першай магіле пералічаны некаторыя імёны: Рубцоў, Мікалай Драніца, Таіса Драніца, Паліна Войцэх, Анатоль Вайцяхоўскі, Фёдар Вількоцкі, Васіль Забалоцкі. Прозвішчы 13 чалавек невядомы... А можа, ужо 12? Бо пераправляўся на той бераг і Міша Усоскі.

### ПРЫКРЫВАЮЧЫ ТАВАРЫШАЎ

31 мая 1943 года выйшаў чарговы нумар падпольнай газеты «Бальшавіцкая праўда», органа партызанскай брыгады «Дзядзькі Колі», рэдактарам якой тады быў Дзмітрый Капыткоў. У артыкуле «Герой» гаварылася пра Мішу Усоскага і яго подзвіг. Капыткоў пазнаёміўся з юнаком яшчэ ў верасні 1942 года: той прыходзіў у рэдакцыю па газеты для партызанаў свайго атрада. Тады ж у рэдакцыі Міша напісаў у газету матэрыял, дзе казаў, што за кроў і смерць свайго бацькі знішчыць дзясяткі фашысцкіх катаў.

Вось што ўспамінаў Дзмітрый Капыткоў пра апошні бой Мішы Усоскага: «Партызаны, якія не паспелі пераправіцца, аказаліся прыціснутымі да ракі. Пачалася пераправа ўплаў. Група прыкрыцця вяла бой. Нарэшце надышла яе чарга пераправіцца, але трэба было застацца яшчэ на некаторы час, каб прыкрыць таварышаў. І тады ў самую вырашальную хвіліну раздаўся голас Мішы Усоскага: «Плывіце ўсе! Застаюся я». Маскіруючыся, юнак перапоўз на другое месца і павёў агонь. Абліваючыся крывёй, апошнім патронам Міша забіў яшчэ аднаго гітлераўца, а затым адну за адной кінуў гранаты. Пад прыкрыццём выбухаў ён паспяшаўся да ракі.



— Не страляць! Узяць жывым! — загадаў фашысцкі афіцэр. Юнак схапіў вінтоўку за ствол і пачаў размахваць ёю. Адбіваўся да таго часу, пакуль аўтаматная чарга не зваліла яго з ног... Жыхары Слабады падабралі на месцы бою некалькі трупаў. У адным з іх апазналі Мішу Усоскага. Магчыма, усе гэтыя падрабязнасці гераічнай барацьбы юнака засталіся б невядомымі. Але застаўся жывым адзін з партызанаў, якія не паспелі пераправіцца. Ён схаваўся ў густой траве і назіраў за трагічным боем... Загадам камандавання атрада «Бура» імя Міхаіла Усоскага было прысвоена аддзяленню, у якім ён ваяваў.

* * *

У партызанскіх дакументах, змешчаных у Нацыянальным архіве, у спісе палеглых партызан брыгады «Дзядзькі Колі» ёсць прозвішчы тых, хто яшчэ загінуў пры пераправе. Яны не значацца на помніках, якія ўсталяваны на брацкіх магілах у Слабадзе. Няма іх і ў пашпарце гэтых пахаванняў. Хутчэй за ўсё, гэта і ёсць тыя 13 чалавек, якія дагэтуль спачываюць невядомымі. Хочацца верыць, што знайшоў там апошні прытулак і юны герой Міша Усоскі.

**Аляксандр ПАЎЛЮКОВІЧ,** *г. Мінск*

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск №27 (374)

■ Крокі да Шагала

# АВАНГАРД.BY

## Дзе ў Беларусі можна ўбачыць творы майстра

**Мы наўрад ці назавём Марка Шагала нацыянальным мастаком, хоць бы таму, што большая частка яго жыцця і творчасці прайшлі на французскай зямлі, але адзін з найвядомейшых авангардыстаў свету — наш навечна натхнёны Віцебскам зямляк. Тут адбылося не толькі яго кароткае навучанне ў майстэрні Юдаля Пэна: ужо пасля атрымання адукацыі ў Санкт-Пецярбургу Марк Шагал вярнуўся ў Віцебск, каб стаць паўнамоцным прадстаўніком па справах мастацтваў Віцебскай губерні, стварыць Віцебскую народную мастацкую школу, афарміць горад да гадавіны рэвалюцыі, рэалізаваць, акрамя гэтага, іншыя мастацкія задумкі і з'ехаць на ПМЖ у Маскву, Берлін і, нарэшце, у Парыж. 7 ліпеня з дня нараджэння мастака споўнілася 130 гадоў, але не кожны з нас, яго землякоў, можа ўбачыць знакамітае палатно «Над горадам», што захоўваецца ў Траццякоўскай галерэі ў Маскве, зайсці ў парыжскі тэатр Гранд-Апера з распісаным Шагалам плафонам ці наведаць спецыяльна створаны для палотнаў авангардыста музей у Ніцы. Не дзіўна, што замежжа больш багатае на Шагала, чым Беларусь, але і на нашай тэрыторыі можна знайсці арыгіналы работ мастака, і завітаць па іх варта ў тры месцы.**

### Арт-цэнтр Марка Шагала ў Віцебску

Гэта першая пляцоўка ў Беларусі, на якой з'явіліся арыгіналы шагалаўскіх работ. Рашэнне аб стварэнні музея было прынята ў 1991 годзе, а сам арт-цэнтр, дзе выстаўляюцца творы, адкрыўся ў 1992 годзе. Уласна з гэтага моманту і пачынаецца складанне калекцыі, бо пасля ад'езду Шагала з Віцебска яго работ у горадзе не было ўвогуле. Сёння збор уключае больш як 300 арыгінальных графічных аркушаў, якія трапілі сюды ў якасці падарункаў. Напрыклад, тры работы, у тым ліку акватынта па матывах афармлення балета «Алека» (адзіны асобнік у свеце), былі перададзены дачкой мастака Ідай Шагал. Яго ўнучкі —

**Самым раннім творам мастака ў калекцыі з'яўляецца гуаш «Лунацік», якая датуецца 1911—1912 гадамі. Яна была набыта за 341 тысячу долараў на аўкцыёне Sotheby's у 2014 годзе.**

Мэрэт і Бэла Мэер — падарылі арт-цэнтру ілюстрацыі да гогалеўскіх «Мёртвых душ», а гэта 96 афортаў у камплекце, якіх на постсавецкай прасторы можна знайсці толькі чатыры. Амаль 130 графічных лістоў музею перадаў калекцыянер Генрых Мандэль, ад якога, дарэчы, арт-цэнтр атрымаў таксама каля двухсот графічных работ класікаў авангарду — Пікасо, Міро, Маціса, Лежэ ды іншых — і дзве з паловай тысячы кніг пра Шагала і еўрапейскі авангард. Калекцыя арт-цэнтра ахоплівае ўвесь перыяд шагалаўскай графікі. Самы ранні твор збору датуецца 1922 годам — гэта афорт да аўтабіяграфіі Шагала «Маё жыццё». Тут жа можна ўбачыць некалькі серый на біблейскую тэматыку — каляровыя літаграфіі 1956 і 1960 гадоў, тры афорты-ілюстрацыі да Бібліі 1930-х гадоў. У калекцыі ёсць пяць афортаў-ілюстрацый да кнігі Марсэля Арлана «Мацярынства». Апошнім па храналогіі творам з тых, што можна ўбачыць у Віцебску, з'яўляецца каляровая літаграфія «Да іншага свету» 1985 года. Можна сказаць, нарэшце, што калекцыя арт-цэнтра — адзін з найбуйнейшых збораў Марка Шагала на постсавецкай прасторы.

### Галерэя «Арт-Беларусь» / Карпаратыўная калекцыя Белгазпрамбанка

Карпаратыўная калекцыя Белгазпрамбанка пачынае сваю гісторыю з 2011 года, і той сумны факт, што ні Нацыянальны мастацкі музей, ні Арт-цэнтр Марка Шагала ў Віцебску не маюць у сваіх калекцыях жывапісных твораў знакамітага віцябляніна, стымуляваў куратараў узяць кірунак на тэрміновы пошук твораў Шагала ў прыватных зборах і на аўкцыёнах. У выніку калекцыя Белгазпрамбанка, — якая на сёння налічвае больш за сотню выдатных артэфактаў, — можа пахваліцца беларускім мастацтвам ад пачатку XVI стагоддзя, уключае ў сябе значны збор мастакоў Парыжскай школы — ураджэнцаў Беларусі ды іншых беларускіх аўтараў замежжа, — мае шэсць шагалаўскіх арыгіналаў. Два з іх — гэта літаграфіі на паперы «Акрабатка на кані» 1959 года і «Аўтапартрэт» 1973-га. Яшчэ чатыры — «Лунацік», «Гадзіннік на палаючым небе», «Зялёны пейзаж» і «Закаханыя» — прадстаўляюць жывапіс Марка Шагала. Самым раннім творам мастака ў калекцыі з'яўляецца гуаш «Лунацік», якая датуецца 1911—1912 гадамі. Яна была набыта за 341 тысячу долараў на аўкцыёне Sotheby's у 2014 годзе. Самая позняя шагалаўская работа збору — малюнак «Закаханыя» 1981 года, набыты Белгазпрамбанкам у 2012-м на аўкцыёне Christie's за больш чым пяцьсот тысяч долараў. Не так даўно, у красавіку гэтага года, карпарацыйная калекцыя Белгазпрамбанка атрымала пастаянную пляцоўку ў Палацы мастацтваў — галерэю «Арт-Беларусь», дзе ў любы момант працоўнага часу сярод іншых здабыткаў беларускай культуры можна ўбачыць і шэсць твораў Марка Шагала.

**Тры работы, у тым ліку акватынта па матывах афармлення балета «Алека» (адзіны асобнік у свеце), былі перададзены дачкой мастака Ідай Шагал.**

### Нацыянальны мастацкі музей Беларусі

Толькі 24 ліпеня 2012-га — у год, калі Беларусь адзначала 125-годдзе з дня нараджэння Марка Шагала, — у калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея з'явіліся творы знакамітага земляка. Старшыня праў-



«Закаханыя». Фота з архіва праекта «Арт-Беларусь».

лення Белгазпрамбанка Віктар Бабарыка ўрачыста ўручыў кіраўніку музея Уладзіміру Пракапцову два графічныя аркушы Марка Шагала, выкананыя ў тэхніцы акватынтаў. Гэта дзве літаграфіі на лейтматыўную для мастака біблейскую тэматыку «Крыжовы шлях» і «Бачанне Апакаліпсіса», створаныя ў 1967 годзе. Графічныя аркушы былі набытыя Белгазпрамбанкам на аўкцыёне Christie's, на абодвух пад выявамі можна ўбачыць подпіс аўтара — Marc Chagall. Гэтыя літаграфіі занялі сваё месца ў пастаяннай экспазіцыі музея, праўда, часам іх здымаюць, каб даць работам «адпачыць»: графіка патрабуе асабалівых умоў захоўвання. У гэты момант, дарэчы, у музеі праходзіць прымеркаваная ўжо да 130-годдзя з дня нараджэння мастака выстаўка «Марк Шагал: Колер любві» са збору Музея Марка Шагала ў Віцебску — графічныя работы будуць выстаўляцца тут да 15 верасня.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.** *katsyalovich@zviazda.by*

■ З нагоды

# Брат Якуба Коласа — настаўнік, літаратар, перакладчык Евангелля

**Літаратурны вечар, прымеркаваны да 120-годдзя з дня нараджэння малодшага брата Песняра, прайшоў у Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва.**



Гадзіннік Міхася МІЦКЕВІЧА.

Дзядзькам беларускага класіка Якуба Коласа быў вядомы моваЗнаўца, пісьменнік, педагог Язэп Лёсік. Літаратурныя здольнасці меў і Міхась Міцкевіч, малодшы брат народнага паэта. Міхась Міхайлавіч таксама вучыўся ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі, друкаваў свае апавяданні на старонках беларускіх газет і быў адзначаны Максімам Гарэцкім як «вельмі спадзейны малады белетрыст і паважаны публіцыст».

Якуб Колас ганарыўся, што Міхась — адзіны з яго чатырох братоў — таксама выбраў шлях настаўніка, і клапаціўся аб ім пасля смерці бацькі. Аднак у сярэдзіне XX стагоддзя адлегласць паміж братамі вымяралася ўжо тысячамі кіламетраў... Палову жыцця (а гэта 47 гадоў!) Міхась Міцкевіч правёў у эміграцыі.

— Міхась Міцкевіч займаўся грамадска-палітычнай дзейнасцю, разам з Язэпам Лёсікам быў арганізатарам і дэлегатам Усебеларускага з'езда ў 1917 годзе, — расказвае ўнучка Якуба Коласа Марыя Міцкевіч. — Шмат гадоў працаваў настаўнікам беларускай мовы і быў перакананы, што «глаўная рухомая сіла культурнага поступу і духоўных здольнасцяў нацыі — гэта яе родная школа».

У 1921 годзе братоў падзяліла першая дзяржаўная мяжа: вёска Смольня, дзе Міхась жыў з братам Юзікам, апынулася на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Пасля далучэння Заходняй Беларусі да БССР Міхась працаваў настаўнікам, дырэктарам школы, школьным інспектарам. Займаў пасаду школьнага інспектара і ў часы нямецкай акупацыі. На выстаўцы ў архіве-музеі былі прадстаўлены публікацыі ўспамінаў пра Міхася Міцкевіча, дзе згадваецца, што настаўнік дапамагаў палонным і партызанам. Тым не менш ён апынуўся ў эміграцыі. Там далучыўся да грамадскай працы: ствараў беларускія школы, быў адным з заснавальнікаў славутай гімназіі імя Янкі Купалы, у якой займаў пасаду дырэктара пачатковай школы.

Настаўнікі самі пісалі чытанкі, падручнікі, і Міхась Міцкевіч зноў узяўся за пяро. Адзін з цікавых экспанатаў выстаўкі — рукапіснае «Чытанне для дзяцей першага года навукі» Міхася Міцкевіча. Побач на паліцы — «Скаўцкі спадарожнік». Як адзначае Марыя Міцкевіч, беларускія дзеці ў лагерах былі захопленыя скаўцкім рухам, гэта дапамагала перажываць нялёгкі час на чужыне. Міхась Міцкевіч удзельнічаў і ў арганізацыі рэлігійнага жыцця: напрыклад, быў ініцыятарам стварэння Брацтва Жыровіцкай Божай Маці.

У 1950 годзе перабраўся ў ЗША. Вольны ад працы час зноў прысвячаў грамадскай дзейнасці: быў намеснікам старшыні Галоўнай Управы Беларуска-Амерыканскага Задзіночання, старшынёй выдавецкага фонду «Беларус», рэдактарам газеты «Беларус» і часопіса «Голас Царквы». Як адзначыў прафесар мінскіх духоўных семінарыі і акадэміі і Інстытута тэалогіі БДУ айцец Сяргей Гардун, асаблівай увагі вартая перакладчыцкая дзейнасць Міхася Міцкевіча: у ЗША ён здзейсніў пераклад на беларускую мову Святога Евангелля.

Сябры і вучні згадвалі Міхася як чалавека добрага, веруючага, упэўненага ў сабе, які заўсёды памятаў і любіў сваю Бацькаўшчыну.

Імя Міхася Міцкевіча, як і іншых прадстаўнікоў беларускай эміграцыі, доўгі час было амаль не вядомым на Радзіме.

— Пра Міхася Міцкевіча я ўпершыню пачуў, калі быў студэнтам універсітэта. У Мікалаеўшчынскай школе, дзе настаўнічалі славутыя сваякі Якуба Коласа, пра яго ніколі не расказвалі, — заўважыў пісьменнік Яўген Хвалей. — Калі б мы з аднакласнікамі ведалі пра малодшага брата паэта, які жыў у Амерыцы, выдаваў царкоўны часопіс і шмат працаваў для царквы, то яшчэ больш ганарыліся б, што жывём у вёсцы, дзе нарадзіўся Якуб Колас, і вучымся ў школе, якая носіць яго імя.

Марыя Міцкевіч бачыла брата свайго дзеда толькі аднойчы, у 1990 годзе — за год да яго смерці. На той час Міхась Міцкевіч жыў з сям'ёй пляменніка Алеся і ўжо пачуваўся не вельмі добра. Сваякі маюць намер аб'яднаць пад адной вокладкай артыкулы, пераклады і ўспаміны Міхася Міцкевіча. У яго творчай спадчыне ёсць і вельмі цікавыя тэксты, напрыклад «Кароткі ўспамін», прысвечаны Якубу Коласу, які друкаваўся ў Беларусі толькі аднойчы ў скарочаным варыянце.

**Янка НАТАВЕЦ**

■ Класікі і сучаснасць

# СЛОВЫ, УВАСОБЛЕНЫЯ Ў ГРАФІЦЫ

## У доме-музеі Якуба Коласа можна ўбачыць новы партрэт Песняра

**Разам з іншымі графічнымі работамі Міхася Басалыгі ён экспануецца ў межах выставачнага праекта «Словы і рэчы: невядомыя калекцыі», прымеркаванага да 135-годдзя Якуба Коласа.**



Фота Кастуся ДРОБАВА.

На выстаўцы «Мастацкія вобразы роднага краю» прадстаўленыя прадметы, рукапісы і мастацкія работы з фондаў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа, а таксама з прыватнай калекцыі Міхася Басалыгі. Невялікая экспазіцыя змяшчае асабістыя рэчы, якімі карыстаўся паэт, яго адзенне і посуд, праз фотаздымкі і рукапісы расказвае пра стасункі Якуба Коласа з перакладчыкамі яго вершаў на рускую мову. Адметная мастацкая частка выстаўкі — тут можна пабачыць графічныя работы Міхася Басалыгі, якія ён выканаў для зборніка перакладаў паэзіі Коласа на рускую мову, што пабачыў свет тры дзесяцігоддзі таму, а таксама для выдання трылогіі «На ростанях», якое выйшла ў 2006 годзе.

— Вельмі рэдка мы паказваем на выстаўках адзенне Якуба Коласа, тут жа можна пабачыць капялюш, гальштук і кашулю, якія насіў паэт. Вельмі рэдка дэманструем і вось гэты кубачак, адзіны з тых, што застаўся з дома Коласа пасля вайны, — распавядае **старшы навуковы супрацоўнік музея Наталля АДАМОВІЧ.** — Калі сын паэта Даніла першы вярнуўся ў Мінск у 1944 годзе і прыйшоў да бацькаўскага дома, што ў той час знаходзіўся ў парку Горкага, то на яго месцы пабачыў толькі яму. Знайшоў аскепкі кубачка, які нашы супрацоўнікі рупліва склеілі.

У цэлым жа новая выстаўка дэманструе, як вывы, намаляваныя мастаком, ператвараюцца з асобнай графічнай работы ў ілюстрацыю да кнігі. Тут упершыню шырокай публіцы прадстаўлены арыгінальныя ілюстрацыі да трылогіі «На ростанях», можна пабачыць, якімі ўявіў Міхась Басалыга прыгажуню Ядвісю, настаўніка Лабановіча. Экспазіцыя прадстаўляе таксама фотаздымкі перакладчыкаў вершаў беларускага класіка на рускую мову і іх рукапісы. Гэта, напрыклад, Сяргей Гарадзецкі, з якім сябраваў Колас, Яўген Мазалькоў (дарэчы, менавіта яму класік перад смерцю пісаў ліст, які і сёння ляжыць на стале ў яго мемарыяльным кабінеце), Аляксандр Пракоф'еў.

— Асобнай увагі заслугоўвае партрэт Якуба Коласа, напісаны Міхасём Басалыгам сёлета, — дадае Наталля Аляксандраўна. — Тут мастак паспрабаваў паказаць вобраз класіка ў часы Вялікай Айчыннай вайны, у 1942 годзе. Гэта быў вельмі цяжкі год у жыцці паэта. Ён знаходзіўся ў эвакуацыі ў Ташкенце, сям'я нічога не ведала пра сына Юрку і шукала яго. У нас у фондах ёсць партрэт работы мастачкі Таццяны Жырмундскай, намаляваны менавіта ў дзень нараджэння Коласа ў 1942 годзе. Міхась Басалыга хоць не бачыў паэта ў той дзень, аднак здолеў вельмі добра паказаць яго вобраз.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

«Хоум Вояж!»

**РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ**

Завершилась рекламная игра «Хоум Вояж!», участие в которой можно было принять в период с 19 апреля по 19 июня 2017 года.

**Для участия в розыгрыше призов было необходимо:**

• Приобрести товар или услугу на сумму от 100,00 (ста) белорусских рублей, 00 копеек и более в одном чеке на территории проведения рекламной игры в период проведения рекламной игры
• Зарегистрировать чек на сайте www.igra.tczamok.by
• Ждать результаты розыгрыша

По результатам проведения рекламной игры все 9 призов нашли своих победителей!

| N п/п | Фамилия | Имя | Отчество | Дата | Название приза |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Никулина | Анастасия | Анатольевна | 20.06.2017 | Фоторамка Ritmix RDF-1014 и денежное вознаграждение 6,19 руб. |
| 2 | Кудинова | Вероника | Николаевна | 20.06.2017 | Фоторамка Ritmix RDF-1014 и денежное вознаграждение 6,19 руб. |
| 3 | Боханова | Антонина | Геннадьевна | 20.06.2017 | Фоторамка RitmixRDF-814 и денежное вознаграждение 3,74 руб. |
| 4 | Якушевич | Ольга | Петровна | 20.06.2017 | Фоторамка RitmixRDF-814 и денежное вознаграждение 3,74 руб. |
| 5 | Юрченко | Александр | Александрович | 20.06.2017 | Фотокамера цифровая зеркальная Canon EOS 700D + EFS1855IS STM 8596B031 и денежное вознаграждение 131,19 руб. |
| 6 | Абушкевич | Тамара | Никифоровна | 20.06.2017 | Набор из 6 (шести) подарочных карт «Корона» по 50,00 руб. каждая и денежное вознаграждение 28,24 руб. |
| 7 | Зайцев | Александр | Дмитриевич | 20.06.2017 | Набор из 6 (шести) подарочных карт «Корона» по 50,00 руб. каждая и денежное вознаграждение 28,24 руб. |
| 8 | Павлюкевич | Мария | Геннадьевна | 20.06.2017 | Чемодан SAMSONITE COSMOLITE V22*00 307 V22*00 307 и денежное вознаграждение 114,78 руб. |
